Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 СНЕЖНЯ 2023 г. АЎТОРАК № 245 (30125)

ЯК ПРАВІЛЬНА ПАДКЛЮЧЫЦЬ ГІРЛЯНДЫ? 6

ШТО ПРАДУГЛЕДЖАНА «ЎКАЗАМ ДЛЯ ДАЧНІКАЎ» 8

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Літаральна гэтымі днямі па даручэнні кіраўніка дзяржавы Адміністрацыя Прэзідэнта сумесна з іншымі дзяржаўнымі органамі завяршае распрацоўку абноўленай Канцэпцыі дзяржаўнай кадравай палітыкі. Бо прайшло ўжо больш за 20 гадоў, з'явіліся новыя тэндэнцыі, фактары, змяніліся падыходы. Гэта стратэгічны дакумент, які будзе вызначаць асноўныя кірункі дзяржаўнай кадравай палітыкі, пытанні размеркавання працоўных рэсурсаў у рэгіянальным, галіновым разрэзах, работу з маладымі кадрамі. У цэлым, арганізацыя работы з кадрамі, якая ўключае адбор, расстаноўку, выхаванне, залежыць ад кожнага кіраўніка на канкрэтным участку. Будзь гэта раённы выканаўчы камітэт або дырэктар прадпрыемства, які клапоціцца аб абнаўленні кадраў. Тым больш у краіне рэалізуюцца ўсе сацыяльныя праграмы, накіраваныя на падтрымку маладых спецыялістаў і іншых катэгорый насельніцтва».*

# Навагодні хэнд-мэйд

Фота БелТА.

**Вучні віцебскай гімназіі № 8 з дапамогай педагога дадатковай адукацыі Аліны БІЛЮТАВІЧУТЭ *(у цэнтры)* вырабілі каля 100 сімвалаў надыходзячага 2024 года. Гімназісты стваралі цацкі з тканіны, вязалі з яркай пражы, выразалі з паперы, дрэва і іншых падручных матэрыялаў. Частка работ школьнікаў адправілася на конкурсы, у тым ліку рэспубліканскую «Калядную зорку».**

Нашы людзі

## ДЗЕВЯЦЬ ГІСТОРЫЙ МАЛАДЫХ УРАЧОЎ

**На Гомельшчыне сталі вядомыя імёны пераможцаў конкурсу «Лепшы малады спецыяліст аховы здароўя — 2023». Падобныя спаборніцтвы правялі ў вобласці ўпершыню. За званне пераможцы змагаліся дзевяць пачынаючых урачоў — спецыялістаў устаноў аховы здароўя з Гомеля, Рэчыцы, Рагачова, Жлобіна, Нароўлі, Буда-Кашалёва і Жыткавіч. Арганізатарамі конкурсу выступілі галоўнае ўпраўленне аховы здароўя Гомельскага аблвыканкама і Гомельская абласная арганізацыя Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя.**

СТАР. 3

Кібербяспека

## НАДТА ТАННА! МО ПАДМАННА?

### Як не стаць «мамантам» (ахвярай), калі на цябе палюе дропер

**Пакупка ці продаж маёмасці на гандлёвых пляцоўках у інтэрнэце, Telegram-сэрвісах, сетцы Instagram можа ў любы момант звесці чалавека з махляром, які забярэ грошы і знікне. У падман беларусаў часта ўводзяць і званкамі на тэлефон, іграючы на эмоцыях і фактары раптоўнасці. Сёлета ў краіне здарылася ўжо 15 700 выпадкаў махлярства, а колькасць кіберзлачынстваў вырасла на 6 %. Пры гэтым звыш 80 % пацярпелых ведалі пра існаванне такога віду махлярства, аднак усё роўна трапілі ў пастку. Застрахавацца ад ашуканства немагчыма, але можна яму супрацьстаяць, калі захоўваць цвярозую галаву, а не лямантаваць. Што трэба праверыць, каб не згубіць грошы, і як дзейнічаць, калі вас намагаюцца «развесці», расказалі спецыялісты.**

СТАР. 5

## КАРАТКА

- **Распараджэннем кіраўніка дзяржавы прэзідэнцкія стыпендыі прызначаны 74 маладым вучоным.**
- ВУП Беларусі ў студзені — лістападзе вырас на 3,8 працэнта.
- **Белстат распрацаваў два новыя інфармацыйныя парталы рэгіянальных даных.**

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Калі мы дамовімся па пэўных пытаннях, у нас не будзе ні тармажэння, ні адступлення ад гэтых дамоўленасцяў»

## Прэзідэнт вызначыў кірунке супрацоўніцтва з Маскоўскай вобласцю

**У якасці кіраўніка расійскага рэгіёна Андрэй Вараб'ёў наведвае Беларусь упершыню. У рамках візіту губернатар прыняў удзел у адкрыцці бізнес-форуму прадпрыемстваў і арганізацый Беларусі і Маскоўскай вобласці, які праходзіць на базе Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень», правёў шэраг сустрэч. Асноўная адбылася ў Палацы Незалежнасці.**

### НАЙЛЕПШЫ ПАКАЗЧЫК ЗА ЎСЮ ГІСТОРЫЮ СУПРАЦОЎНІЦТВА

На пачатку сустрэчы Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што напярэдадні Новага года ёсць аб чым пагаварыць, у тым ліку вызначыць планы на будучы год. «Ёсць кірункі, па якіх мы можам узмацніць наша супрацоўніцтва, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Дзякуючы вашаму прафесіяналізму і каманды Маскоўская вобласць трывала ўтрымлівае лідарскія пазіцыі ў Расійскай Федэрацыі па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця».

Сталічны рэгіён Расіі — стратэгічны партнёр Беларусі. Па аб'ёме гандлю з нашай краінай Маскоўская вобласць займае першае месца сярод суб'ектаў федэрацыі. За 10 месяцаў 2023 года тавараабарот павялічыўся амаль на чвэрць і ўжо перавысіў 9 мільярдаў долараў. Гэта значнае дасягненне з улікам высокай базы і істотнага росту ў 2022 годзе. Па прагнозах, сёлета ён будзе прыкметна вышэйшы за 10 мільярдаў долараў. Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, гэта найлепшы паказчык за ўсю гісторыю супрацоўніцтва Беларусі з Маскоўскай вобласцю.

Гандаль паміж нашай краінай і гэтым расійскім рэгіёнам ажыццяўляецца практычна па ўсёй наменклатуры тавараў. Асноўныя з іх — бытавая тэхніка, прадукты харчавання, металапрадукцыя, лекавыя прэпараты, тэхніка, запчасткі да яе і многае іншае. «Зразумела, што такі ўзровень тавараабароту абумоўлены ў значнай ступені спецыфікай становішча Маскоўскай вобласці, якая ўяўляе сабой свайго роду лагістычны хаб і базу для далейшых паставак у іншыя расійскія рэгіёны», — патлумачыў Прэзідэнт.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, дылерства і гандаль — гэта добра, але яны занадта залежаць ад бягучай кан'юнктуры. «Вы, як чалавек дасведчаны, добра ведаеце, што задачай любога кіраўніка з'яўляецца стварэнне гарантый працаўладкавання і дабрабыту для людзей, — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — У гэтых мэтах нам патрэбен сур'ёзны задзел у выглядзе вытворчасці ўласнай прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю на сумесных прадпрыемствах».

### АД СУМЕСНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ ДА ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННЯ

Беларускі лідар прапанаваў абмеркаваць наступныя кірункі супрацоўніцтва Беларусі і Маскоўскай вобласці.

Першы — дарожнае будаўніцтва і тэхніка для жыллёва-камунальнай гаспадаркі. «Вы актыўна займаецеся тэмай дарожнага будаўніцтва і камунальнай гаспадаркі, ураўліва актыўна займаецеся, — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт. — Мне паведамляюць, што ў бягучым і наступным годзе маеце намер укласці значныя сродкі ў абнаўленне парка і набыццё тэхнікі беларускай вытворчасці. Нашы спецыялісты ў найбліжэйшы час разам з вамі вызначаць неабходную спецыфікацыю, і, я даю вам слова, мы зробім усё неабходнае, каб адгрузкі пачаліся строга па графіку і мы выканалі ўсе абавязацельствы, якія будуць разгледжаны па дагаворы».

Другі — вытворчасць сухіх будаўнічых сумесяў на базе беларускага цэменту. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў гэтым не абмяжоўвацца і дадаць выраб бетону. Дадзены тавар мае больш высокую дабаўленую вартасць. Яго вытворчасць будзе арганізавана ў раёнах узвядзення буйных аб'ектаў жыллёвага і дарожнага будаўніцтва. «Наша міністэрства будаўніцтва і архітэктуры гатова прапрацаваць з вашай камандай лагістыку і магчымасці размяшчэння бетоназмяшальных магутнасцяў на тэрыторыі вобласці».

Трэці — абслугоўванне, пастаўка запасных частак, гарантыя, фінансавыя інструменты. «Па дадзеных тэмах у нас вялікі вопыт у Расіі, — канкрэтызаваў Прэзідэнт. — Але з дапамогай вашага рэгіёна мы хацелі б надзейна замацавацца, стварыўшы сур'ёзны сэрвісна-лагістычны хаб для гэтай часткі Расійскай Федэрацыі».

Чацвёрты — медыцынскія паслугі і рэабілітацыя. «Вы праяўлялі да гэтай тэмы цікавасць, — нагадаў беларускі лідар. — Можаце на нас разлічваць. Многія масквічы і жыхары сталічнага рэгіёна ўжо пабывалі ў нашых здраўніцах, скарысталіся паслугамі медыцынскіх установ. Мы і далей будзем трымаць гэты ўзровень. Трэба зрабіць так, каб кошт камплектуючых, калі мы кажам аб медыцынскім абсталяванні, і паслуг не біў па кішэні звычайных, простых грамадзян. Гэта датычыцца і сертыфікацыі». Прэзідэнт расказаў, што даручыў паслу Беларусі ў Расіі Дзмітрыю Крутому прапрацаваць гэтае пытанне.

Пяты — развіццё кааперацыйных сувязяў і стварэнне новых вытворчых ланцужкоў для імпартазамяшчэння. «Ведаю, вы вельмі актыўныя ў гэтым плане: імпартазамяшчэнне для вашай вобласці — прыярытэт прыярытэтаў, — канкрэтызаваў кіраўнік дзяржавы. — У вашым рэгіёне на шматлікіх стадыях знаходзіцца больш за 200 праектаў з агульным коштам пад 200 мільярдаў рублёў. Для нашай эканомікі гэтыя задачы таксама маюць першарадную важнасць. І ў гэтым плане мы назапасілі добры вопыт. Мы вельмі шмат, часта абмяркоўваем гэтыя пытанні з Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі. І хачу з задавальненнем адзначыць, што, напэўна, лепш за ўсё мы працуем з Маскоўскай вобласцю».

Шосты — агра-прамысловы комплекс. «Мы можам паспяхова дапаўняць адно аднаго і ў аграрным сектары, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Трэба толькі вызначыцца з найбольш перспектыўнымі тэмамі. Не сакрэт, што Беларусь уваходзіць у лік сусветных лідараў па экспарце мяса-малочных прадуктаў. Мы пастаянна мадэрнізуем свае прадпрыемствы, набываем новае абсталяванне, у нас ёсць магчымасці для аказання садзейнічання ў развіцці ў вас мяса-малочнай і малочна-таварнай вытворчасці, паставак элітнага насення беларускай селекцыі, высокапрадукцыйных кармоў і прэміксаў, а таксама ўгнаенняў. Ведаю, што ў вас ёсць кампаніі, якія вельмі паспяховыя ў гэтым плане, і вопыт для нас будзе вельмі важны».

Сёмы — удзел беларускіх спецыялістаў у будаўніцтве шматлікіх аб'ектаў. «Значны патэнцыял бачыцца ва ўдзеле будаўнікоў у рэалізацыі праектаў у жыллёвым, сацыяльна-інфраструктурным і дарожным будаўніцтве, — адзначыў беларускі лідар. — Нашы прадпрыемствы гатовы прапанаваць не толькі будаўнічыя паслугі, але і тэхніку».

Восьмы — навукова-тэхнічнае ўзаемадзеянне. «Маскоўская вобласць валодае адным з найбуйнейшых у Расіі навукова-тэхнічным комплексам, і Беларусь зацікаўлена ў пашырэнні супрацоўніцтва па розных пытаннях навукова-тэхнічнай дзейнасці, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — Думаю, мы маглі б сфарміраваць пэўны план навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва або, як модна казаць, дарожную карту па ўзаемадзеянні нашай Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Маскоўскай вобласці».

Аляксандр Лукашэнка перакананы, што ў імя будучыні нашых народаў неабходна даць усе магчымасці для зносін і ўзаемных паездак беларускай і расійскай моладзі. «Аб'яднаць маладое пакаленне сумесным мерапрыемствамі, доўгатэрміновымі праектамі, — канкрэтызаваў ён. — Думаю, вы са мной пагодзіцеся, што ва ўмовах цяперашніх рэалій гэта як ніколі актуальна».

Рэзюмуючы вышэйсказанае, Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь гатова да адкрытага прадметнага дыялогу па ўсіх вызначаных пытаннях двухбаковага супрацоўніцтва. «Хачу вас запэўніць: калі мы дамовімся па пэўных пытаннях, у нас не будзе ні тармажэння, ні адступлення ад гэтых дамоўленасцяў, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Нам Маскоўская вобласць для супрацоўніцтва ў рамках Расіі архіважная. Мала таго, што гэта найбуйнешая вобласць. Як я ўжо казаў, праз Маскоўскую вобласць мы можам супрацоўнічаць да Урала, з усёй заходняй Расіяй».

У сваю чаргу Андрэй Вараб'ёў адзначыў: «Пасол Беларусі ў Расіі Дзмітрый Крутой вельмі актыўны, справаджае ўсе важныя кірункі. Мы сёння тут для таго, каб выказаць павагу, падзяку за вашу пазіцыю, ваша стаўленне. Мы разумеем і цэнім значнасць нашага супрацоўніцтва, значнасць Беларусі ва ўсіх адносінах».

Па словах кіраўніка расійскага рэгіёна, Беларусь і Кітай для Маскоўскай вобласці з'яўляюцца двума самымі буйнымі партнёрамі па экспарце і імпарце. «Рэгіён вялікі. Мы з Масквой расцём амаль на 200 тысяч чалавек у год, і будаўніцтва ў нас вельмі прыкметнае. І сацыяльныя аб'екты, і дарожная інфраструктура — усё гэта мае патрэбу ў матэрыялах. Вядома, мы зацікаўлены. І калегі падабралі ўжо шэраг лакацый для арганізацыі такой выставы», — адзначыў ён. Невыпадкова для Маскоўскай вобласці ўяўляюць цікавасць пастаўкі машынабудаўнічай тэхнікі з Беларусі.

**Вераніка КАНЮТА.**

### ❍ У тэму

У размове з журналістамі **губернатар Маскоўскай вобласці Андрэй ВАРАБ'ЁЎ** распавёў, што супрацоўніцтва з нашай краінай ажыццяўляецца па многіх напрамках. «Мы любім Беларусь, — падкрэсліў ён. — Мае калегі-губернатары, сустракаючыся з Аляксандрам Рыгоравічам, падкрэсліваюць яго дзелавы настрой і прыкладныя пытанні, якія затым трэба будзе вырашаць, — і яны даюць вынік».

Па словах губернатара, усе кірункі, якія падчас сустрэчы вызначыў Аляксандр Лукашэнка, маюць важнае значэнне і для развіцця Беларусі, і для развіцця Расіі, у прыватнасці Падмаскоўя. «Працоўныя месцы, падаткі, у нас вельмі вялікая будоўля ў Маскоўскім рэгіёне, і прадпрыемствы Беларусі заўсёды могуць знайсці сабе годнае месца і па пастаўцы матэрыялаў, і па выкананні работ, — патлумачыў Андрэй Вараб'ёў. — Другая вялікая тэма — усё, што датычыцца сельскай гаспадаркі і патэнцыялу экспарту прадукцыі за мяжу. 25 % рэгіянальнага прадукту Маскоўскай вобласці — гэта гандаль. У нас буйныя хабы, і гэта дазваляе вытворцам экспартаваць сваю прадукцыю ў розныя куточкі свету».

Губернатар расказаў, што ў Падмаскоўі дзейнічаюць індустрыяльныя паркі, дзе размяшчаюцца вытворчасці. Прадугледжаны спецыяльныя ўмовы, у тым ліку фінансавыя — ільготныя крэдыты пад 5–7 % гадавых. «Адпаведна, і беларускія кампаніі могуць сябе ў гэтым знайсці, — дадаў ён. — Як сказаў Прэзідэнт, мы можам рэалізоўваць сумесныя мерапрыемствы. Гэта машынабудаванне, перапрацоўчая прамысловасць, выраб і глыбейшая перапрацоўка матэрыялаў, сыравіны. Усе гэтыя магчымасці ў нас ёсць».

Асобную ўвагу падчас сустрэчы з губернатарам Маскоўскай вобласці Прэзідэнт удзяліў культурнаму і адукацыйнаму абмену. «У нас, у Падмаскоўі, ёсць флагманскія школы, якія з вялікім задавальненнем прымуць хлопцаў і дзяўчат з Беларусі і, адпаведна, прыедуць сюды для таго, каб пагутарыць, абмяняцца меркаваннямі, поглядамі, — заўважыў кіраўнік расійскага рэгіёна. — Выкладчыкі могуць абменьвацца методыкамі выхавання, выкладання. Усё гэта дазволіць нам лепш разумець адзін аднаго. Мы шануем адносіны з Беларуссю і хацелі б, каб у нас былі агульныя інтарэсы».

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Эксперты прагназуюць рэцэсію ў Германіі

Спецыялісты Нямецкага эканамічнага інстытута (IW) чакаюць рэцэсіі ў Германіі ў 2024 годзе, паведаміла служба навін Tagesschau. На фоне глабальнага крызісу і спрэчак наконт федэральнага бюджэту яны прагназуюць, што эканамічныя паказчыкі ФРГ налета працягнуць падаць. Так, паводле меркавання экспертаў, ВУП Германіі ў 2024-м знізіцца на 0,5 працэнта, у горшым выпадку — нават на 1 %. Гэта будзе другі год запар са скарачэннем эканомікі. «Федэральны ўрад адыграў вырашальную ролю ў гэтым крызісе», — заявіў дырэктар IW Міхаэль Хютэр. «Нямецкая эканоміка з усіх сіл спрабуе пазбегнуць стагнацыі», — адзначылі спецыялісты. Аднак, паводле іх слоў, «станоўчай эканамічнай дынамікі не прадбачыцца». Паводле ацэнак IW, «агульныя ўмовы застаюцца настолькі дрэннымі, што дабіцца поспеху не ўдасца». Даныя Федэральнага аб'яднання малых і сярэдніх прадпрыемстваў ФРГ (BVMW) пацвердзілі, што сёлета эканамічная сітуацыя ў краіне пагоршылася. Больш за 84 % з каля 1200 апытаных сярэдніх кампаній лічаць эканамічную сітуацыю «горшай» ці нават «значна горшай», чым у мінулым годзе. Каля 43 % указалі на тое, што становішча іх кампаній пагоршылася. Каля 40 % чакаюць гэтага і налета.

### У Заходнім паўшар'і зарэгістравана больш за 4 мільёны выпадкаў ліхаманкі Дэнге

Небяспечнае захворванне масава распаўсюджваецца ў краінах Заходняга паўшар'я. Сёлета зарэгістравана больш за 4 мільёны яго выпадкаў у Амерыцы і Карыбах, што перавышае папярэдні рэкорд 2019 года. Пра гэта паведаміла агенцтва Associated Press. Ад Багамаў да Бразіліі папярэджваюць аб перапоўненых клініках і новых выпадках штодня. Больш за дзве тысячы смерцяў зарэгістравана ў гэтым рэгіёне. Эксперты папярэджваюць, што павышэнне тэмператур і ўрбанізацыя паскараюць інфекцыі. Дрэнная санітарыя і недасканаласць ахоўных сістэм спрыяюць росту захворванняў. Кліматычныя анамаліі, накшталт засух і паводак, таксама павялічваюць шанцы распаўсюджвання віруса праз камароў. У 2023 годзе ў Паўночным паўшар'і было самае спякотнае лета, а жнівень аказаўся на 1,5 градуса цяплейшы за сярэднія значэнні. Павышаныя тэмпературы пашыраюць арэал пасялення камароў і паскараюць развіццё віруса. Эксперты перасцерагаюць, што кліматычныя змены і ўрбанізацыя могуць зрабіць ліхаманку ўсё больш распаўсюджаным і складаным для кантролю захворваннем. Было зарэгістравана больш за 4,5 мільёна выпадкаў ліхаманкі ў 80 краінах, зафіксавана звыш 4 тысяч выпадкаў смяротнага зыходу. Вакцыны ёсць, але няма спецыфічных лекаў для лячэння віруса пасля заражэння.

### Трапічныя лясы Амазоніі рызыкуюць ператварыцца ў савану

Бразільскі навуковец Карлуш Нобрэ паведаміў, што трапічныя лясы Амазоніі могуць стаць сухой травяністай саванай з-за кліматычных змяненняў. Аб гэтым паведаміла ТАСС. Па словах Карлуша Нобрэ, сухі сезон на поўдні Амазоніі працягваецца нашмат даўжэй. Дагэтуль ён доўжыўся тры-чатыры месяцы, а зараз — чатыры-пяць месяцаў, адзначыў вучоны. Раней міністр нафты, прыроднага газу і біяпаліва Бразіліі Пітэру Сампаю Мендэш паведаміў, што засуху ў рэгіёне лясоў басейна Амазонкі можна назваць адной з найбольш маштабных за апошні час.

Парламенцкі дзённік

# СУПРАЦОЎНІЦТВА — ПА ЎСІХ НАПРАМКАХ

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА прыняў удзел у пасяджэнні 65-й сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі ў Маскве

**Саюзныя парламентарыі адобрылі змяненні і дапаўненні ў Дэкрэт Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы «Аб бюджэце Саюзнай дзяржавы на 2023 год», зацвердзілі бюджэт Саюзнай дзяржавы на 2024 год, а таксама план-графік і план міжнароднай дзейнасці Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі на будучы год.**

За кошт бюджэтных сродкаў плануецца прафінансаваць пяць праграм і 37 мерапрыемстваў Саюзнай дзяржавы ў сферах энергетыкі, інфармацыйных тэхналогій, космасу, медыцыны, сельскай гаспадаркі, пагранічнай бяспекі. **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** выказаў упэўненасць, што бюджэт Саюзнай дзяржавы на 2024 год стане эфектыўным інструментам рэалізацыі праектаў і праграм, якія асабліва запатрабаваны на сучасным этапе інтэграцыі.

Характарызуючы бягучую сітуацыю ў галіне саюзнага будаўніцтва, спікер ніжняй палаты парламента адзначыў, што беларускім і расійскім бакамі працягваецца работа па выкананні Асноўных напрамкаў рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2021—2023 гады. Поўнасцю, па яго словах, выкананы 22 саюзныя праграмы — 94 % з запланаваных мерапрыемстваў.

Уладзімір Андрэйчанка заўважыў, што беларуска-расійскія адносіны развіваюцца па ўсіх напрамках. «Дзякуючы стратэгічнай лініі кіраўнікоў нашых дзяржаў паміж Беларуссю і Расіяй выбудаваны трывалыя сувязі, — канкрэтызаваў ён. — Гэтаму садзейнічаюць розныя фарматы міжурадавага і міжпарламенцкага ўзаемадзеяння, сумесныя камісіі і міжгаліновыя рабочыя групы, цесныя кантакты паміж рэгіёнамі. У бягучым годзе Беларусь наведала 87 дэлегацый рознага ўзроўню з рэгіёнаў Расіі, а ў расійскіх рэгіёнах з візітамі былі 96 беларускіх афіцыйных дэлегацый».

Спікер адзначыў паспяховую рэалізацыю сумесных праграм, інвестыцыйных праектаў, а таксама пашырэнне кааперацыйных сувязяў. «Узрастаючая дынаміка інтэграцыйнага развіцця аб'ектыўна патрабуе нарошчвання тэмпаў і аб'ёмаў збліжэння нацыянальных прававых сістэм, — падкрэсліў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — У мінулыя гады мы рабілі ўпор на забеспячэнне роўных умоў для суб'ектаў гаспадарання. Цяпер нам неабходна атрымаць канкрэтныя вынікі шчыльнага рэгіянальнага ўзаемадзеяння ў розных галінах. Важна сканцэнтраваць увагу на такіх ключавых сферах, як адзіная прамысловая палітыка, тэхналагічны суверэнітэт, фінансавая ўстойлівасць Саюзнай дзяржавы».

Уладзімір Андрэйчанка звярнуў увагу на важнасць падрыхтоўкі нарматыўных дакументаў, якія датычацца рэгулявання пытанняў субсідзіравання грамадзянскіх авіяперавозак паміж рэгіёнамі Расіі і Беларусі, выпрацоўкі механізму прызнання тэхналагічных аперацый для беларускіх тавараў з мэтай доступу да субсідый і іншых відаў падтрымкі. Неабходна таксама завяршыць распрацоўку праекта мадэльнага заканадаўчага акта аб прыгранічным супрацоўніцтве, а таксама праграмы міжрэгіянальнага і прыгранічнага супрацоўніцтва. «У цэлым варта засяродзіцца на практычных праектах, здольных надаць сур'ёзны стымул для далейшага эканамічнага росту, — перакананы Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Варта прааналізаваць існуючыя мясцовыя ініцыятывы, якія могуць быць рэалізаваны пры падтрымцы Саюзнага бюджэту».

У сваім выступленні спікер закрануў тэму выбараў, якія адбудуцца ў 2024 годзе ў Беларусі і Расіі. «Безумоўна, гэтыя выбарчыя кампаніі будуць скарыстаны ЗША і Захадам у мэтах дыскрэдытацыі ўлады нашых краін, саюзнага будаўніцтва, і трэба быць гатовымі даць годны адпор спробам умяшання ў справы суверэнных дзяржаў», — заявіў ён.

Акрамя таго, Уладзімір Андрэйчанка звярнуў увагу на дзве юбілейныя даты, якія будуць адзначацца ў наступным годзе — 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 25-годдзе падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. У сувязі з гэтым ён выказаў упэўненасць, што беларускія і расійскія парламентарыі прымуць самы актыўны ўдзел у інфармацыйна-асветніцкіх мерапрыемствах, прысвечаных гэтым падзеям.

**Паводле прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**

# ДЗЕВЯЦЬ ГІСТОРЫЙ МАЛАДЫХ УРАЧОЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спаборніцтвы маладых спецыялістаў прайшлі ў Гомельскім дзяржаўным медыцынскім ўніверсітэце. Канкурсантам у першым туры неабходна было вытрымаць практычнае і тэарэтычнае выпрабаванні. Удзельнікі дэманстравалі прафесійныя навыкі на базе навучальнага цэнтра практычнай падрыхтоўкі і сімуляцыйнага навучання Гомельскага дзяржмедуніверсітэта. На тэарэтычным іспыце праверылі валоданне маладых спецыялістаў патрабаванняў інфекцыйнага кантролю і эпідэміялагічнай бяспекі. Дарэчы, значная колькасць балаў залічвалася канкурсантам менавіта за паспяховае пераадоленне практычнага

і тэарэтычнага іспытаў. Так што ўдзельнікі, якія ярка выступілі на творчай частцы конкурсу, але не надта добра справіліся з першым турам, не маглі ўжо разлічваць на высокія балы.

У другім туры спаборніцтваў удзельнікі выконвалі два творчыя заданні. Неабходна было правесці прэзентацыю сябе і сваёй прафесіі «Я — малады спецыяліст!», а таксама прадставіць сваё хобі.

Сапраўдную тэатральную мініпастаноўку падрыхтаваў малады спецыяліст Рагачоўскай цэнтральнай раённай бальніцы Сяргей Хайнак. Пачынаючы ўрач-хірург разам са сваімі калегамі сыгралі сцэну барацьбы за жыццё пацыента на аперацыйным стале.

Дарэчы, перад удзелам у конкурсе кожны рыхтаваў эсэ «Маё прафесійнае крэда». Гэтыя работы не ўлічваліся ў агульным заліку, але таксама ўразілі членаў журы як цікавыя гісторыі станаўлення маладых урачоў.

— Выбар маёй прафесіі склаўся выпадкова. Я ніколі не марыла аб белым халаце і фанендаскопе. Вырасла ў сям'і выкладчыкаў і задумвалася пра тое, каб працягнуць дынастыю. Ніколі б не падумала, што мне хопіць сіл і ведаў, каб паступіць у медыцынскі ўніверсітэт і бліскуча яго скончыць. Упэўненасць і падтрымку мне дала мая сям'я, вялікі ёй дзякуй. Сёння не ўяўляю сябе нікім іншым, толькі ўрачом, ні ў якой прафесіі ты не адчуеш сябе такой патрэбнай, — напісала аб сабе **ўрач агульнай практыкі Гомельскай гарадской клінічнай паліклінікі № 8, выпускніца Гомельскага дзяржмедуніверсітэта Соф'я СІВАКОВА**.

Менавіта гэты малады спецыяліст па выніках двух тураў спаборніцтваў стала ўладальніцай галоўнага кубка першага абласнога конкурсу і звання «Лепшы малады спецыяліст аховы здароўя 2023 года». Сярэбраны прыз конкурсу заваявала Дзіяна НАВУМАВА — дзіцячы ўрач-псіхіятр Жлобінскай цэнтральнай раённай бальніцы. Малады ўрач-хірург Рагачоўскай цэнтральнай раённай бальніцы Сяргей ХАЙНАК заняў трэцяе месца. У дадатковай намінацыі «За найвышэйшы прафесіяналізм» дыпломам прызёра адзначана ўрач-анестэзіёлаг-рэаніматолаг, загадчык аддзялення анестэзіялогіі і рэанімацыі Буда-Кашалёўскай цэнтральнай раённай бальніцы Алена КОЗАР.

Прынамсі, Дзіяна Навумава за адзін дзень змагла стаць двойчы прызёрам. Дзіцячы ўрач-псіхіятр Жлобінскай цэнтральнай раённай бальніцы таксама стала сярэбраным прызёрам конкурсу сярод маладых спецыялістаў Жлобінскага раёна.

— Конкурс першы, але ён абяцае стаць добрай традыцыяй. Гэта магчымасць зносін з калегамі, з маладымі спецыялістамі, з тымі самымі ўчарашнімі студэнтамі, — падзяліўся з журналістамі **прарэктар па лячэбнай рабоце Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Уладзімір ПАХАЖАЙ**. — Для медуніверсітэта вельмі важна атрымаць зваротную сувязь ад практычнай аховы здароўя, урачоў, загадчыкаў аддзяленняў. Важна ўбачыць, чым зараз жывуць маладыя спецыялісты, нашы выпускнікі. Дзякуючы конкурсу мы таксама ўбачылі і некаторыя тонкія моманты, ведаем цяпер, дзе ўзмацніць падрыхтоўку будучых спецыялістаў. Пры гэтым мы вельмі рады, што нашы выпускнікі ўсебакова развітыя, актыўныя, вясёлыя, пазітыўныя.

— Конкурс — этап самаразвіцця для пачынаючых урачоў. Смеласць выступіць і заявіць аб сабе кажа пра актыўную жыццёвую пазіцыю, гатоўнасць удзельнічаць у грамадскім жыцці вобласці і краіны, — адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Мікалай КУДЗЕНЬЧУК**.

Па словах **старшыні Гомельскай абласной арганізацыі прафсаюза работнікаў аховы здароўя Надзеі ЗІМІНОЙ**, конкурс на званне лепшага маладога спецыяліста рэгіёна сярод урачоў садзейнічае павышэнню прафесійнага майстэрства. Пераможцы і прызёры атрымалі дыпломы і грашовыя сертыфікаты ад абласнога галіновага прафсаюза.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота ТК «Гомельшчына афіцыйна».**

Тры пытанні да ўлады

# ГЛУСК — ГОРАД ДЛЯ ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ

**Сёлетні год для Глускага раёна можна лічыць спрыяльным. З 13 прагнозных паказчыкаў тут выконваюцца ўсе, акрамя экспарту паслуг і тавараў. Што датычыцца інвестыцый у асноўны капітал, зарплаты, уводу жылля і іншых асноўных паказчыкаў, то тут ёсць чым ганарыцца. Не дрэнна склаліся справы і ў сельскай гаспадарцы. Хаця ў раслінаводстве з-за складанага надвор'я не атрымалася дасягнуць больш высокага ўзроўню, чым летась, але выросла вытворчасць малака, у два разы павялічылася вытворчасць мяса. За паўтара года раён, дзякуючы гэтым тэмпам, трывала перамясціўся з апошняга месца па вобласці ў сярэдзіну. Пра тое, што зроблена і якія планы ставіць перад сабой мясцовая ўлада, у размове са старшынёй Глускага райвыканкама Уладзімірам КНІГАЙ.**

***— Якія найбольш значныя аб'екты былі ўведзеныя ў гэтым годзе? Чым асабіста вы ганарыцеся?***

— Зроблены капітальны рамонт школы № 1, каштарыс якога складаў болей чым 2700 тысяч рублёў. Цалкам заменена падлога, пракладзены новыя камунікацыі і оптавалаконная сувязь, заменены сістэмы вода- і цеплазабеспячэння, на трэцім паверсе будынку зроблены вучэбна-метадычны кластар, які дазваляе аптымізаваць вучэбны працэс. Усталявана сістэма відэаназірання, праведзены капрамонт лесвіц, прыбіральняў, для харчблока закуплена новае высокатэхналагічнае абсталяванне. Райвыканкам дапамог школе абсталяваць камп'ютарны клас. За кошт таго, што атрымалася эканоміць на закупках, дадаткова абнавілі столь і дзверы. Акрамя гэтага, сваімі сіламі быў выкананы дэмантаж, што дало магчымасць будаўнікам у сціслыя тэрміны зрабіць рамонт школы. Да 15 жніўня ён быў ужо завершаны. Зроблена шмат, засталося толькі больш грунтоўна адрамантаваць спартзалу і дафарбаваць фасад.

Яшчэ адзін вельмі значны аб'ект, які дазволіў сёлета выканаць паказчык па інвестыцыях — новы лячэбны корпус на тэрыторыі Веснаўскага дома-інтэрната. Будаўніцтва вядзецца сіламі мясцовай ПМК, увод запланаваны налета. На сёння нам там не хапае муляраў, таму запрашаем усіх жадаючых — і арганізацыі, і індывідуалаў, якія жадаюць падзарабіць. Даем 150 рублёў за кубаметр, хаця пачыналі з 50.

Сёлета пабудавалі ў Глуску новы 16-кватэрны дом, у якім атрымае двухпакаёвую кватэру і маладая сям'я з ліку медыкаў.

***— Раскажыце падрабязней, што робіцца для таго, каб раён быў больш прывабны для маладых спецыялістаў?***

— Нават самі маладыя спецыялісты адзначаюць, што сітуацыя з арэндным жыллём стала апошнім часам мяняцца да лепшага. Створана спецыяльная камісія, якая кантралюе гэта пытанне, выязджае па месцах работы моладзі, цікавіцца станам жылля іх. Сёлета ў раён прыбылі 40 маладых спецыялістаў, з якіх 10 мэтавікоў. Будзем рабіць усё магчымае, каб яны ў нас засталіся, каб утварыліся сем'і. Спецыяльна арганізуем сустрэчы з мясцовай уладай у нефармальнай абстаноўцы, каб яны маглі наўпрост задаваць пытанні і расказваць, чаго ім не хапае. Лічу, што барацьбу за маладога спецыяліста трэба весці, пачынаючы ад прафарыентацыйнай работы. Калі ў арганізацыі ёсць неабходнасць у кадрах, трэба ісці ў школу і настройваць вучня, каб ён атрымаў патрэбную спецыяльнасць і вярнуўся ў раён. Стаўку робім на мясцовую моладзь, а тых, хто сюды прыехаў, імкнёмся зацікавіць, каб не было жадання з'ехаць. Сёлета ў нас была магчымасць закупіць сцэну для вулічных мерапрыемстваў, светлавую і гукавую апаратуру ў Цэнтр культуры і вольнага часу «Арыён». Гэта дазволіць нам праводзіць культурныя мерапрыемствы на больш высокім узроўні, што таксама цікава для моладзі. Да канца года плануем закупіць шмат спартыўнага абсталявання, у тым ліку лыжнай экіпіроўкі, набываем міні-буксіроўшчык для ўкаткі лыжнай трасы. У нас ёсць добрыя спартыўныя базы. Футбалісты з каманды «Пціч» трэці год запар на абласным узроўні ўдзельнічаюць у рэспубліканскіх гульнях «Скураны мяч» на прыз спартклуба. Што датычыцца гандбола, нашым гульцам рады вядучыя беларускія гандбольныя клубы. Магу пахваліцца таксама тым, што не кожны раён праводзіць лыжныя гонкі. Мы ўжо правялі дзве — сярод дзяржслужачых і раённую лыжню, а пасля Новага года плануем арганізаваць яшчэ адну, калі надвор'е дазволіць. З гарбатай, спевамі, флагамі — каб было весела і шматлюдна.

***— Як у раёне выконваецца даручэнне Прэзідэнта «адзін раён — адзін праект»?***

— У мінэканомікі зарэгістраваны праект па стварэнні вытворчасці па фасоўцы і ўпакоўцы замарожанай плодаагароднінай прадукцыі на прадпрыемстве райспажыўкааперацыі «Глускі кошык». Плюс праект, які прапануе наша прыватнае дрэваапрацоўчае прадпрыемства ТАА «Зелянвуд», якое на закінутай вясковай ферме асвоіла выпуск піламатэрыялаў і прадае іх ва Узбекістан. Сёлета там было створана болей чым 20 працоўных месцаў. На «Глускім кошыку» закуплена машына па выдаленню костачкі з вішні, што дазволіць пашырыць асартымент і павялічыць прыбытак.

Хочацца сказаць добрыя словы і ў адрас арганізацый, дзякуючы якім мы справіліся з паказчыкамі. З прыбыткам спрацавалі Глускае ПМК № 249, аўтапарк. На годным узроўні знаходзяцца ПМК «Водбуд», ДРБУ. На тэрыторыі раёна працуе прыватнае прадпрыемства «Тэхнатрансдэталь», якое па падатках у бюджэт практычна дагнала райспажыўкааперацыю. Дваццаць гадоў таму мясцовыя жыхары стварылі вытворчасць і сёння спецыялізуюцца на выпуску спружын рознага прызначэння і памеру. Ёсць яшчэ адно паспяховае прыватнае прадпрыемства «ЦІЗ-М», якое вырабляе цепланізаляцыйныя матэрыялы для памяшканняў, каналізацыі, водаправодных труб. Кампанія выігрывае салідныя тэндэры. Не кожны маленькі раённы цэнтр можа такім пахваліцца.

А яшчэ я ўдзячны ўсім жыхарам раёна за тыя сродкі, якія яны зарабілі на суботніку. Яны былі пералічаныя на нашу раённую сістэму аховы здароўя. Мы набылі неабходнае лячэбнае абсталяванне, правялі рамонты. Налета плануем, акрамя закупкі дадаткова лячэбнага абсталявання, правесці бягучы рамонт паліклінікі і мадэрнізаваць дэзблок, а таксама пабудаваць яшчэ адзін 16-кватэрны арэндны дом. Вялікія планы па дарожным будаўніцтве. Сёлета зрабілі шмат дарог і па горадзе, і ў раёне, але яшчэ хапае вуліц, дзе трэба прыкласці і рукі, і грошы. Створана чарга па дарожных рамонтах, спадзяёмся, што налета задаволім шмат заявак ад насельніцтва.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

Святочны старт

# ДРУЖНА, ДЗЕЦІ, У КАРАГОД!

**Марафон навагодніх урачыстасцяў стартаваў у паўночным рэгіёне. У пятніцу ў рамках агульнагарадской акцыі «Запалім ёлку разам» абласная лясная прыгажуня заззяла сотнямі агнёў, а па горадзе на Дзвіне прайшлі 300 пар Дзедаў Марозаў і Снягурак.**

Разам з галоўнымі чараўнікамі Новага года па вуліцы Леніна пракрочылі каля 400 казачных персанажаў і аркестр. Гэтай добрай традыцыі ў паўночнай сталіцы ўжо амаль 15 гадоў, але штогод арганізатары прыдумваюць новыя сюрпрызы. Так, суправаджаў парад стылізаваны транспарт: былі ў горадзе і навагодні экспрэс ад чыгункі, і квадрацыклы ад МНС, а мультперсанажы праехалі нават на тралейбусе. На плошчы Перамогі, якая стала фінальнай кропкай шэсця, разгарнулася яркая музычна-гульнявая праграма з фаер-шоу. Не абышлося і без галоўнага сімвала надыходзячага года па Усходнім календары — Дракона, які таксама вітаў са сцэны жыхароў і гасцей горада.

З віншаваннямі да віцябчан звярнуўся **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН**. «Зноў свята прыходзіць да нас, у паветры — водар мандарынаў, адчуванне цуду. Дазвольце ад усяго сэрца пажадаць усім міру, дабрабыту, здароўя. Няхай ва ўсіх усё будзе добра і спаўняюцца ўсе мары», — пажадаў кіраўнік вобласці.

Цёплыя словы дарослым і маленькім гараджанам даслаў мэр горада Генадзь Сабыніч. Кіраўніцтва вобласці і горада таксама адзначыла на свяце дзяцей, якія за год дасягнулі найлепшых вынікаў у спорце, вучобе, культуры. Акрамя падзяк яны атрымалі падарункі з рук Дзеда Мароза і Снягуначкі.

У рэшце рэшт зялёная прыгажуня заззяла сотнямі каляровых агнёў. Сёлета яе вышыня склала 35 метраў. А ўпрыгожвае дрэва двухкіламетровая гірлянда, на якой восем тысяч лямпачак. Яшчэ каля 700 страба-лямп дадаюць ёлцы навагодні антураж. Замест леташніх сняжынак сімвал свята ўпрыгожваюць 1200 барвовых і залацістых шароў, а ўсяго на абласной ёлцы размясцілася каля чатырох кіламетраў гірлянд і 10 тысяч лямпачак.

Па традыцыі, на галоўнай сцэне правялі навагоднюю віктарыну, пераможцамі якой сталі восем чалавек — сума лічбаў надыходзячага 2024 года. Прыйшліся даспадобы гараджанам і шматлікія фотазоны, новыя святлодыёдныя арт-аб'екты, якія размясціліся на цэнтральнай плошчы горада.

У гэты ж дзень, 15 снежня, стартавала рэспубліканская дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». Сёлета яна пачалася ў фармаце тэлемоста, да яе актыўна падключыліся дзеці з Віцебскага абласнога палаца дзяцей і моладзі. Павіншаваў краіну з пачаткам дабрачыннай акцыі ў відэафармаце намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў Дурноў, які падкрэсліў, што чужых дзяцей не бывае, таму напярэдадні Новага года з вялікім задавальненнем да акцыі падключаюцца прадстаўнікі ўлады і кіраўнікі арганізацый Віцебшчыны.

У другі дзень акцыі «Нашы дзеці» дэпутат Палаты прадстаўнікоў Таццяна Аўтухова і начальнік аддзела па адукацыі адміністрацыі Першамайскага раёна горада Віцебска завіталі з навагоднімі падарункамі ў шматдзетныя сем'і. Віншаванні ад Дзеда Мароза і яго ўнучкі прымалі сем'і Шункевіч і Гарнак. Акцыя дабра прыйшла снежным ранкам і ў сям'ю Яцукоў з Бешанковічаў, дзе тата Віктар адзін выхоўвае дачку Яну і сына Артура. Цёплыя словы і падарункі прывезлі сям'і член Савета Рэспублікі Ірына Ляўковіч і начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама Марына Навіцкая.

Дабрачынная кампанія «Нашы дзеці» па традыцыі працягнецца да 15 студзеня. Клопатам і ўвагай ахутаны не толькі дзеці, але і людзі пажылога ўзросту — для іх пройдзе акцыя «Ад усёй душы».

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА. Фота «Витьбичи».**

# НАДТА ТАННА! МО ПАДМАННА?

## ЧАКАЎ АПЛАТУ, А ЗАНЯЎСЯ ЛЖЭІНВЕСТАВАННЕМ

Адзін з найбольш распаўсюджаных відаў злачынстваў — фішынг, які мае некалькі разнавіднасцяў. Гэта крадзеж грошай на электронных гандлёвых пляцоўках, дзе чалавек спрабуе прадаць ці набыць нейкі тавар, расказаў **Аляксандр РЫНГЕВІЧ, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці МУС:**

— Калі грамадзянін размяшчае сваю аб'яву, зламыснік піша яму паведамленне пра гатоўнасць набыць тавар. Найчасцей за ўсё ён не таргуецца, высвятляе мінімальныя характарыстыкі тавара, пасля чаго кажа патэнцыяльнай ахвяры, што ён ужо афарміў дастаўку тавара ці пералічыў грошы ў адрас гандлёвай пляцоўкі і дасылае спасылку на інтэрнэт-рэсурс, які знешне вельмі падобны на той, пра які ён вядзе гаворку. Перайшоўшы на сайт, падмануты прадавец уводзіць рэквізіты сваёй банкаўскай карткі, мяркуючы, што зараз ён атрымае грошы. Аднак адбываецца наадварот — грошы з карткі знікаюць.

**«Найбольш значная праблема — павелічэнне цяжкіх злачынстваў, калі грамадзяне, знаходзячыся пад уздзеяннем зламыснікаў, прыходзяць у банкі і афармляюць на сваё імя крэдыты, якія пасля пералічваюць на рахункі аферыстам ці кладуць на свае плацежныя карткі, рэквізіты ад якіх паведамляюць злачынцам».**

Часам махляры нахабнічаюць настолькі, што пытаюцца, колькі ў чалавека грошай на балансе, каб скрасці адтуль як мага больш за адну аперацыю, а не рабіць некалькі спісанняў. Калі на картцы сродкаў няма, махляры выдаюць сябе за службу падтрымкі інтэрнэт-рэсурсу і кажуць чалавеку, што для правядзення аперацыі на рахунку павінна быць пэўная сума. Такім чынам стымулююць патэнцыяльную ахвяру пакласці на картку больш грошай.

Яшчэ адзін від фішынгу, які сёлета стаў вельмі распаўсюджаны, — аплата паслуг і тавараў на фэйкавых сайтах (копіях інтэрнэт-рэсурсаў), створаных зламыснікамі (найчасцей банкаўскіх).

— Калі людзі не ўсталёўваюць на тэлефоне мабільную праграму, а хочуць нешта аплаціць (напрыклад, камунальныя паслугі), яны ўводзяць пошукавы запыт на камп'ютары, каб трапіць у інтэрнэт-банкінг. Аднак не звяртаюць увагу, што спасылка на сапраўдны рэсурс можа быць на другім ці трэцім месцы пошуку, а ціснуць на першую ж спасылку ў спісе і трапляюць на зусім не на той рэсурс. Тут яны ўводзяць свае логін і пароль, мяркуючы, што ўвайшлі ў інтэрнэт-банкінг, а на справе — даюць доступ да сваіх рэквізітаў злачынцам, якія могуць не толькі скрасці ўсе грошы з карткі, але і ўзяць інтэрнэт-крэдыт, — папярэдзіў Аляксандр Рынгевіч.

Апошні год у сацсетках актыўна развіваецца яшчэ адзін від фішынгу — ілжэінвеставанне (у крыптавалюту, кампаніі, якія развіваюцца), удакладніў **Іван СУДНІКОВІЧ, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення лічбавага развіцця папярэдняга следства Следчага камітэту (СК):**

— Зламыснікі ствараюць фэйкавыя старонкі, якія напаўняюць навінамі. А з дапамогай штучнага інтэлекту робяць рэкламныя ролікі, якія манціруюць з выкарыстаннем слоў вядомых людзей, і грамадзяне на гэта вядуцца.

## ПАПРАСІ БОЛЬШ ФОТА, ПРАВЕР ПРАДАЎЦА!

Акрамя аферыстаў-пакупнікоў, ёсць і зладзеі-прадаўцы. Несапраўдныя аб'явы з таварам па зніжаным кошце змяшчаюць у сетцы Instagram (найбольш распаўсюджанае месца для падману) і на буйных гандлёвых пляцоўках накшталт «Куфара» ці «Барахолкі» («Анлайнер»). Пад выглядам продажу нейкіх рэчаў (асабліва сезонных) часта ствараюцца фэйкавыя старонкі. Цяпер гэта могуць быць ёлкі і навагодняя падарункі, вясной — садовая мэбля, арэлі. Людзі часта спакушаюцца менавіта на заніжаны кошт, расказаў **Дзмітрый БУРДЗЮК, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку Міністэрства ўнутраных спраў**:

— Злачынцы падтрымліваюць такія старонкі. Каб стварыць выгляд, што яны сапраўдныя, на такіх старонках ёсць падпісчыкі, каментарыі, падабайкі, водгукі. Грамадзяне ўступаюць у перапіску з уладальнікамі тавару і пераводзяць перадаплату, а то і ўсю суму за тавар. У выніку грошы зніклі, тавар не прыйшоў, а старонка выдалена — усе сувязі паміж пакупніком і прадаўцом абарваны.

**Кіберзлачыннасць — гэта не асобныя махляры, а транснацыянальныя прафесійна арганізаваныя групоўкі, якія складаюцца з некалькіх соцень, а то і тысяч чалавек. Уваходзяць у іх жыхары Беларусі, Расіі, Украіны, якія маюць свае каналы і чаты, рэкламуюць сваю дзейнасць і зручны спосаб заробку.**

Падобныя злачынствы, як правіла, няцяжкія, бо сумы перадаплат невялікія. Аднак такіх «здзелак» вельмі шмат.

— Каб не стаць ахвярай, пакупніку трэба скрупулёзна вывучаць прадаўца. Звяртаць увагу на неправераных прадаўцоў. Здымак з таварам можна праверыць праз інтэрнэт, бо часта менавіта адтуль зламыснікі іх і бяруць, і сетка выдасць вам, дзе яшчэ ёсць такое фота, — параіў спецыяліст. — Падчас перапіскі можна папрасіць дасласць здымак тавару з іншага ракурса, штрых-код тавару (калі гэта мабільны ці іншая тэхніка). Вядома, прадавец не зможа выканаць такую просьбу. Аднак, на жаль, пакупнік робіць праверку ўжо пасля падману.

## МАЙЦЕ НА ЎВАЗЕ!

• Супрацоўнікі банкаў і праваахоўных органаў не звоняць праз месенджары, не запытваюць ніякую персанальную інфармацыю, не заклікаюць да ўдзелу ў спецаперацыях. Калі паступае званок з падобнымі прапановамі, проста пакладзіце трубку.

• На прыладах састарэлых людзей і дзяцей варта ўвогуле забараніць магчымасць званкоў у месенджарах з нумароў, якіх няма ў тэлефоннай кнізе.

• Правіла добрага тону сучаснага чалавека — мець некалькі банкаўскіх картак: асобна для зарплаты, асобна для пакупак праз інтэрнэт.

• Бацькі павінны ведаць, чым займаюцца іх дзеці ў інтэрнэце, адкуль у іх з'яўляюцца грошы. А калі чуюць ад сваіх нашчадкаў слэнгавыя словы накшталт «воркер», «дроп» ці «мамант» (пацярпелы, ахвяра), гэта сігнал для трывогі. Потым будзе позна.

## СПЕЦАПЕРАЦЫЯ ПА ТЭЛЕФОНЕ

Супрацьдзейнічаць кіберзлачыннасці ў Беларусі цяжка, нягледзячы на ўсе прафілактычныя меры, адзначыў Аляксандр Рынгевіч:

— Найбольш значная праблема — павелічэнне цяжкіх злачынстваў, калі грамадзяне, знаходзячыся пад уздзеяннем зламыснікаў, прыходзяць у банкі і афармляюць на сваё імя крэдыты, якія пасля пералічваюць на рахункі аферыстам ці кладуць на свае плацежныя карткі, рэквізіты ад якіх паведамляюць злачынцам.

Яшчэ адзін распаўсюджаны спосаб крадзяжу — званкі на тэлефон. Гэта не новы від махлярства, аднак цяпер ён «удасканаліўся» — злачынцы ўсё часцей намагаюцца схіліць сваіх абанентаў да ўдзелу ў «спецыяльных аперацыях».

— Зламыснікі іграюць цэлы спектакль. Яны тэлефануюць і пад выглядам банкаўскіх работнікаў і супрацоўнікаў праваахоўных структур прапануюць грамадзянам устанавіць на мабільны тэлефон дадатковую праграму (якая дасць дазвол на аддалены доступ да тэлефона), а спасылку на яе або дасылаюць чалавеку, або інструктуюць, дзе можна спампаваць гэтую праграму. Часам нават дасылаюць людзям копіі нейкіх службовых дакументаў, выкарыстоўваюць прозвішчы сапраўдных супрацоўнікаў (як правіла, гэта кіраўнікі высокага ўзроўню, інфармацыя пра якіх даступная ў інтэрнэце).

Далейшы сцэнарый залежыць ад паводзін пацярпелага. Калі чалавек дае зместкі ад сваёй карткі для нібыта пералічэння сродкаў на абароненыя рахункі ці для пераправеркі персанальных даных, грошы крадуць. Калі махляры адчуваюць, што падман можна працягваць, яны адпраўляюць чалавека зняць грошы з дэпазіту ці аформіць крэдыт.

— Часам такое ўздзеянне вядзе да крымінальных учынкаў ужо самімі пацярпелымі, якія яны рабілі, мяркуючы, што ўдзельнічаюць у спецаперацыі, і здзясненне якіх патлумачыць лагічна не маглі, — удакладніў Аляксандр Рынгевіч.

Яшчэ адзін від кібератак на людзей — вішынг — калі кол-цэнтр махляроў знаходзіцца па-за межамі краіны. Яго аператары тэлефануюць грамадзянам і вымушаюць выканаць нейкія дзеянні, каб выратаваць свае грошы, і ўрэшце «вымываюць» у іх усе сродкі. Пры гэтым уплываюць на тых людзей, у каго амаль няма грошай: шматдзетных і маламаёмасных.

— Зладзеі забіраюць і назапашаныя сродкі, і вымушаюць браць крэдыты, прадаваць кватэры і аўто, нібыта гэтая маёмасць удзельнічае ў зламысных схемах, і каб яе выратаваць, трэба прадаць, а грошы пералічыць махлярам, — падзяліўся Іван Судніковіч. — Урэшце здзекуюцца настолькі, што прымушаюць запісаць прыніжальнае відэа і здзейсніць нейкія злачынствы: падпаліць машыну міліцыянера або абліць зялёнкай супрацоўніка банка.

**«Каб не стаць ахвярай, пакупніку трэба скрупулёзна вывучаць прадаўца. Звяртаць увагу на неправераных прадаўцоў. Здымак з таварам можна праверыць праз інтэрнэт, бо часта менавіта адтуль зламыснікі іх і бяруць, і сетка выдасць вам, дзе яшчэ ёсць такое фота. Падчас перапіскі можна папрасіць дасласць здымак тавару з іншага ракурса, штрых-код тавару (калі гэта мабільны ці іншая тэхніка). Вядома, прадавец не зможа выканаць такую просьбу. Аднак, на жаль, пакупнік робіць праверку ўжо пасля падману».**

## ТУРЭМНЫЯ ТЭРМІНЫ ЗА ПЕРАДАЧУ ЎЛАСНЫХ ДАНЫХ

Кіберзлачыннасць — гэта не асобныя махляры, а транснацыянальныя прафесійна арганізаваныя групоўкі, якія складаюцца з некалькіх соцень, а то і тысяч чалавек. Уваходзяць у іх жыхары Беларусі, Расіі, Украіны, якія маюць свае каналы і чаты, рэкламуюць сваю дзейнасць і зручны спосаб заробку, падзяліўся Іван Судніковіч:

— Звычайныя грамадзяне ўступаюць у такія групоўкі і пачынаюць атакаваць сваіх суайчыннікаў і жыхароў іншых краін. Кіраўніцтва такіх махлярскіх груп, у тым ліку скангруп, якія займаюцца фішынгам, знаходзіцца па-за межамі Беларусі. А тут «працуюць» іх хаўруснікі, якія дапамагаюць рабіць злачынствы. Асноўны напрамак, з якога атакуюць, на жаль, Украіна, дзе засяроджана і кіраўніцтва, і асноўныя групоўкі, і кол-цэнтры. Туды ж выводзіцца большасць скрадзеных грошай. Праблема ў тым, што хаця мы ведаем, хто і адкуль нас атакуе, аднак узаемадзеянне ў праваахоўнай сферы паміж краінамі абцяжарана, таму юрыдычна абясшкодзіць іх пакуль немагчыма.

Каб супрацьдзейнічаць транснацыянальнай кіберзлачыннасці, праваахоўнікі і банкаўскія структуры выпрацавалі стратэгію. Кантралююцца і маніторацца ўсе найбуйнейшыя групоўкі, якія атакуюць беларусаў. Фіксуецца іх дзейнасць і ўдзельнікі. А галоўная задача — дайсці да арганізатараў груповак, дзе б яны ні знаходзіліся. Другі кірунак работы — пазбавіць зламыснікаў інструментарыю — магчымасці ствараць і актывізаваць фішынгавыя сайты на тэрыторыі Беларусі. Распрацаваны алгарытм, дзякуючы якому выяўленыя фішынгавыя сайты цягам сутак блакіруюцца, часам нават да здзяйснення злачынстваў, удакладніў спецыяліст.

Выяўляць беларускія банкаўскія карткі і сім-карты, неабходныя групоўкам, каб званіць беларусам і выводзіць іх грошы, — яшчэ адзін кірунак работы праваахоўнікаў і банкаўскіх структур. Ужо налета спецыялісты, як спадзяюцца, змогуць практычна ў аўтаматычным рэжыме выяўляць злачынны ланцужок, калі грошы, скрадзеныя ў пацярпелага, пераводзяць на падстаўныя сайты, каб вывесці за межы Беларусі.

Яшчэ адна задача — перарываць дзейнасць беларускіх хаўруснікаў, якія дапамагаюць рабіць арганізаваным групоўкам, што дзейнічаюць за мяжой, злачынствы супраць сваіх суайчыннікаў.

— Такіх выканаўцаў у скан-групах называюць «воркеры». Яны пішуць і звоняць ахвярам, вымушаюць іх перавесці грошы. Іншыя хаўруснікі — дропы (драпаводы — асобы, якія аб'ядноўваюць дропаў у групы) — асобы, якія дзясяткамі і сотнямі рэгіструюць на сябе банкаўскія карткі і перадаюць іх у карыстанне арганізаванай групе злачынцаў. За апошні год на тэрыторыі Беларусі і Расіі затрыманы тры буйныя групоўкі, якія апошнія тры гады атакавалі беларусаў і за гэты час здзейснілі больш за 20 тысяч крадзяжоў. У склад гэтых груповак уваходзіла некалькі тысяч чалавек. Затрымана таксама і частка кіраўніцтва груповак.

Абяцаннем лёгкага заробку ў такія групоўкі ўцягваюцца, на жаль, і непаўналетнія, і ўсе яны будуць праходзіць як удзельнікі арганізаваных злачынных груп (па адпаведным артыкуле ўнаватым пагражае зняволенне да 12 гадоў). З практыкі: рэальны тэрмін атрымліваюць да шасці гадоў. Крымінальная адказнасць за незаконны распаўсюд рэквізітаў банкаўскіх картак з карыслівых памкненняў дзейнічае ў Беларусі два гады. Перадача нават адной карткі, кода доступу да рахунку, асабістага нумара з пашпарта — ужо нагода для крымінальнай справы і падстава для вобшуку. Тэрмін пазбаўлення волі тут, па словах спецыялістаў, да дзесяці гадоў.

Наступны год, дарэчы, як абазначаюць для сябе праваахоўнікі, пройдзе для іх пад лозунгам «вайна з дропамі».

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Беражыце сябе!

# КАБ ГІРЛЯНДА НЕ ЎСПЫХНУЛА. ЛІТАРАЛЬНА

## Некалькі правілаў электрабяспекі

**Вось і набліжаюцца зімовыя святы — Каляды і Новы год. Вуліцы гарадоў, вітрыны магазінаў і кафэ, будынкі арганізацый і прадпрыемстваў упрыгожваюцца разнастайнымі гірляндамі.**
**Каб прадухіліць выпадкі электрычнага траўматызму і пажараў падчас навагодніх масавых мерапрыемстваў, усе работы па мантажы і падключэнні дадатковых электраўстановак, гірлянд і святочнай ілюмінацыі павінны ажыццяўляюцца падрыхтаванымі спецыялістамі. Амаль у кожным доме будуць ставіць і ўпрыгожваць ёлкі. Таму варта ведаць элементарныя правілы электрычнай бяспекі пры выкарыстанні электрычных прылад для ўпрыгожвання. Пра тое, як не дапусціць няшчасных выпадкаў, правільна выбраць гірлянду і засцерагчы сваіх дзяцей, расказаў намеснік генеральнага дырэктара — галоўны інжынер ДУ «Дзяржаўны энергетычны і газавы нагляд» Аляксандр ГУЛЕВІЧ.**

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

### МЕНШ ЗА 25 ВОЛЬТ НА «ВЫХАДЗЕ» ГІРЛЯНДЫ — ЛЕПШ ЗА ЎСЁ

Спецыяліст адзначыў, што пры падключэнні да электрычнай сеткі гірлянд і ілюмінацыі чалавек можа трапіць пад дзеянне электрычнага току і ў выніку атрымаць электратраўму альбо ў памяшканні можа ўзнікнуць пажар.

Паводле яго інфармацыі, інцыдэнты могуць адбывацца па некалькіх прычынах. Напрыклад, калі ў сетцы няма апаратаў ахоўнага адключэння. Маюцца на ўвазе не толькі аўтаматы ў электрычных шчытках, але і спецыяльныя прылады, якія ўстаўляюцца ў разетку і такім чынам іграюць ролю засцерагальніка.

Электрычная траўма можа адбыцца па прычыне непасрэднага дотыку да адкрытых токаводных частак — пашкоджанага корпуса разеткі, правадоў і іншых электрапрыбораў. Таксама да няшчаснага выпадку можа прывесці выкарыстанне няякасных матэрыялаў пры падключэнні гірлянд, у тым ліку прымяненне самаробных гірлянд або вырабаў сумніўнай вытворчасці.

«Пажаранебяспечныя сітуацыі ўзнікаюць таксама пры падключэнні гірлянд на адкрытым паветры без уліку ступені іх абароны, а таксама пакіданне ўключаных гірлянд без кантролю на працяглы час», — распавёў Аляксандр Гулевіч.

Увага! Эксперт дадаў, што падключэнне гірлянд і святочнай ілюмінацыі павінна ажыццяўляцца толькі ад электрычнай сеткі, абсталяванай апаратамі абароны. Пры гэтым у сеткі напружаннем 220 вольт неабходна ўстанаўліваць прыладу ахоўнага адключэння. Электрычныя ўпрыгажэнні з напружаннем менш за 25 вольт з'яўляюцца найбольш бяспечнымі.

### КАЛІ ГІРЛЯНДА ЗА ГОД «ПАТУХЛА»

Нічога, кажа наш чалавек, паправім. І бярэцца выпраўляць няспраўнасць самастойна, але... Часам удар токам атрымліваюць людзі ў тым выпадку, калі пашкоджана ізаляцыя. Таму трэба загадзя, да падключэння да разеткі, пераканацца, што ізаляцыя і правады не пашкоджаныя ці не адарваныя.

«Каб не дапусціць электратраўмы і пажару, варта ажыццяўляць рамонт любых электрапрыбораў толькі з адключэннем іх ад сеткі, — падкрэсліў спецыяліст. — Неабходна даверыць правядзенне такога рамонту выключна кваліфікаванаму прафесіяналу. Трэба памятаць, што нельга замацоўваць электрычныя правады і кабелі з моцным нацяжэннем, падвяргаць іх іншым механічным уздзеянням, а таксама размяшчаць паблізу ад крыніц цяпла (напрыклад, батарэі або адкрытага агню). Таксама неабходна выкарыстоўваць гірлянды толькі заводскага вырабу. Перад уключэннем гірлянд і ілюмінацый у электрасетку важна ўважліва вывучыць інструкцыю па іх эксплуатацыі».

Яшчэ ён звярнуў увагу на недапушчальнасць падключэння гірлянды да сеткі дзецьмі, бо яны не могуць ацаніць у поўнай меры яе тэхнічны стан. Дзяцей трэба папярэдзваць аб небяспецы.

«Акрамя гэтага, неабходна візуальна пераканацца ў адсутнасці пашкоджанняў электрычнага кабеля, штэпсельнай вілкі і іншых электрычных элементаў ўпрыгожвання да падключэння іх да электрасеткі. Трэба неадкладна адключыць электрапрыбор ад сеткі пры з'яўленні прыкмет аплаўлення ізаляцыі, дыму, непрыемнага паху і іскрэння», — раіць Аляксандр Гулевіч.

### ВЫВУЧЫМ МАРКІРОЎКУ ПАД ЛУПАЙ

Асобна спецыяліст спыніўся на выкарыстанні прылад ахоўнага адключэння. Па статыстыцы Дзяржаўнага энергетычнага і газавага нагляду, прыкладна да 40 % няшчасных выпадкаў можна было б пазбегнуць, калі б у сетцы стаялі прылады ахоўнага адключэння.

«Гэта прылада даказвае сваю эфектыўнасць, а ахоўныя апараты такога тыпу свабодна прадстаўлены ў гандлёвай сетцы. Акрамя таго, на сённяшні дзень у продажы маюцца нават разеткі з убудаванай прыладай ахоўнага адключэння», — адзначыў галоўны інжынер арганізацыі.

Паводле яго слоў, на выставе Energy Expo іх установа, у ліку іншых распрацовак, прадставіла практычны стэнд, які імітуе спрацоўванне стацыянарна ўстаноўленай прылады ахоўнага адключэння ў двухправадной электрычнай сетцы. «Любы, хто жадае, мог убачыць прынцып работы такіх прылад і даведацца ўсе перавагі іх выкарыстання. Улічваючы станоўчы эфект, прымяненне падобных стэндаў будзе пашырацца», — запэўніў Аляксандр Гулевіч.

### ДЫК ЯК ЖА ВЫБРАЦЬ ГІРЛЯНДУ ДЛЯ ЎПРЫГОЖВАННЯ ІНДЫВІДУАЛЬНАГА ДОМА, КВАТЭРЫ І ДАЧЫ?

Тут спецыяліст звярнуў увагу на тое, што ўсе гірлянды і ілюмінацыі, якія падключаюцца, павінны адпавядаць месцу і ўмовам размяшчэння.

«Пры выбары ўпрыгожванняў трэба звярнуць увагу на маркіроўку ступені абароны электрапрыбора. Так, прыбор з маркіроўкай IP 20 прызначаны толькі для выкарыстання ўнутры сухіх памяшканняў. Калі на прыбор нанесеная маркіроўка IP 44, то ён можа выкарыстоўвацца і па-за памяшканнем, але павінен быць размешчаны пад навесам. У цэлым, размяшчаць гірлянды на вуліцы можна са ступенню абароны IP 54 і вышэйшай. Так, маркіроўка IP 67 азначае, што прыбор з'яўляецца водатрывалым. Упрыгожванні з такой маркіроўкай будуць найбольш бяспечнымі для дэкарацыі індывідуальнага дома і вуліцы», — растлумачыў Аляксандр Гулевіч.

Акрамя ступені абароны, на вырабе можа быць нанесены малюнак хаткі са стрэлачкамі. Калі стрэлачкі накіраваны ўнутр дома, значыць, гірлянда можа размяшчацца толькі ўнутры памяшкання. Калі ж стрэлачкі накіраваны ад дома, значыць, прыбор можа выкарыстоўвацца і на вуліцы.

У выпадку надзвычайнага здарэння з электрычнасцю, аварыі або пашкоджання электрапрыбораў важна памятаць і выконваць асноўнае правіла бяспекі — перш за ўсё, неабходна неадкладна адключыць пашкоджаны элемент ад электрасілкавання. Калі ж адбылося ўзгаранне, трэба як мага хутчэй адключыць аўтаматычныя выключальнікі або пробачныя засцерагальнікі ў электрычным шчытку. Менавіта таму кожны жыхар дома павінен ведаць, дзе знаходзяцца яго аўтаматычныя выключальнікі. У крытычны момант гэта можа зберагчы памяшканне і людзей ад пажару.

### МІНСК БУДЗЕ ЗІХАЦЕЦЬ ДА СЯРЭДЗІНЫ СТУДЗЕНЯ

А сталіцу, як навагоднюю ялінку, ужо «загарнулі» ў мноства святочных агнёў. **Намеснік галоўнага інжынера УП «Мінгарсвятло» Дзмітрый СЫРАМАЛОТАЎ** распавёў нам, што сёлета Мінск ужо ўпрыгожылі больш за 12 тысяч гірлянд рознай мадыфікацыі. З іх 10 тысяч вісяць уздоўж праспектаў і вуліц, а 2,2 тысячы ўпрыгожылі 26 навагодніх ёлак. Напружанне апошніх складае 24 вольты, а ступень абароны — IP 67.

Святочная ілюмінацыя запалілася ў Мінску 10 снежня і прадоўжыць радаваць вока да 15 студзеня ўжо наступнага года. На ўвесь гэты перыяд у мэтах папярэджання ўзнікнення якіх-небудзь аварый і няшчасных выпадкаў арганізавана дзяжурства аператыўных выязных брыгад.

«Агульная магутнасць ілюмінацыі ў Мінску складае каля 987 кВт. Пры гэтым устаноўленая магутнасць ілюмінацый усіх ёлак у сталіцы — каля 153 кВт. Так, галоўная ёлка краіны на Кастрычніцкай плошчы ўпрыгожаная 128 гірляндамі. Электрычная магутнасць гірлянд на ёлцы і ўсіх усталяваных на плошчы канструкцый — 35 кВт», — расказаў Дзмітрый Сырамалотаў.

Сёлета ў Мінску з'явіліся новыя арт-аб'екты, якія свецяцца. Так, у раёне Палаца спорту ўсталяваны светлавы фантан вышынёй 5 метраў. Акрамя таго, новыя ілюмінацыі размясцілі на вуліцах Маякоўскага, Ташкенцкай, Кабушкіна, Асаналіева і ў Севастопальскім парку. Прыязджайце і любуйцеся.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Надвор'е

# Цёплы вецер з Атлантыкі

## Дзякуючы яму тэмпературны фон будзе значна вышэйшы за норму

**Апошнім часам у нас назіраецца ўстойлівы заходне-ўсходні перанос паветраных мас на тэрыторыю краіны. Такім чынам, працягваюць паступаць добра прагрэтыя паветраныя масы з Атлантыкі, а ў выніку гэтага адзначаецца не па сезоне цёплае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Гэта прывядзе да таго, што ў аўторак днём месцамі дыскамфорту будзе дадаваць моцны парывісты вецер, а ў чацвер пагодны маятнік зноў хіснецца ў бок зімы.

А 19 снежня на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. Ноччу і раніцай месцамі згусціцца слабы туман, днём чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад плюс 2 градусаў да 8 цяпла.

У сераду на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе ў межах ад 0 да плюс 6 градусаў.

У чацвер на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. На асобных участках дарог галалёдзіца. Ноччу месцамі па захадзе краіны ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла.

У пятніцу часам пройдуць ападкі (мокры снег, дождж). Месцамі ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы слупкі тэрмометра пакажуць ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла, а ўдзень — мінус 1 — плюс 6 градусаў.

Згодна з папярэднім прагнозам айчыннага сіноптыкаў, няўстойлівы характар надвор'я захаваецца ў нашай краіне і ў выхадныя.

У суботу на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. Ноччу месцамі ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература ўначы дасягне мінус 4 — плюс 2 градусаў, а ўдзень — мінус 2 — плюс 5 градусаў.

Амаль такое ж надвор'е чакаецца і ў нядзелю. Часам прагназуюцца ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы сіноптыкі абяцаюць мінус 5 — плюс 2 градусы, а ўдзень — ад мінус 1 градуса на поўначы да 7 цяпла на поўдні краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЯК НЕ ДАПУСЦІЦЬ МАРНАВАННЯ ГРОШАЙ ПРЫ БУДАЎНІЦТВЕ

## Рэвізоры Гродзенскай вобласці прааналізавалі сітуацыі з даўгабудамі

**Большасць раёнаў рэгіёна за апошнія тры гады значна скарацілі колькасць незавершаных будаўнічых аб'ектаў. Але сёлета быццам расслабіліся. Да такога выніку прыйшлі ўдзельнікі пасяджэння калегіі Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці сумесна з прадстаўнікамі выканаўчай улады рэгіёна.**

### НАВЕСЦІ ПАРАДАК

Увага да аб'ектаў звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва надаецца ў адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы і патрабаваннямі Дырэктывы № 8 «Аб прыярытэтных кірунках развіцця будаўнічай галіны», якая ўступіла ў дзеянне ў 2019 годзе. Пасыл зразумелы — сотні даўгабудаў не эксплуатуюцца, а значыць, не прыносяць даходу. Між тым у будаўніцтва ўкладзены значныя дзяржаўныя сродкі. З цягам часу сітуацыя з іх «разборкамі» толькі пагаршаецца.

У Гродзенскай вобласці за два гады і дзевяць месяцаў зроблены даволі значны рывок у скарачэнні аб'ектаў звышнарматыўнага будаўніцтва. Вынікі дасягнуты дзякуючы сумеснай рабоце КДК і Гродзенскага аблвыканкама.

— Па кожным аб'екце былі заслуханы планы мерапрыемстваў з боку кіраўнікоў гарадскога і раённых выканаўчых камітэтаў. Дэталёва разглядаўся кожны аб'ект. З пункту гледжання іх рэальнай патрэбы скарэкціраваны рэгіянальныя і галіновыя мерапрыемствы на 2021—2025 гады па скарачэнні такіх аб'ектаў-даўгабудаў. І большасць раёнаў спрацавалі нядрэнна, — зазначыў

Фота КДК Гродзенскай вобласці.

**старшыня КДК Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОЖКА.**

### ТРЫМАЦЦА ПЛАНА

Калі па стане на 1 студзеня 2021 года на тэрыторыі рэгіёна налічвалася 458 аб'ектаў звышнарматыўнага будаўніцтва, то за два гады і дзевяць месяцаў іх колькасць знізілася на 402, ці амаль на 90 працэнтаў.

— На 1 кастрычніка 2023 мы выйшлі з лічбай 56. Але і гэтая лічба магла быць меншай, калі б усе суб'екты гаспадарання своечасова выконвалі зацверджаны рэгіянальны план. Існуюць такія аб'екты, якія да гэтай пары яшчэ не знесены альбо эксплуатуюцца без акта ўводу ў эксплуатацыю. Між тым пры правільным падыходзе праблему можна вырашыць літаральна за некалькі дзён, — упэўнена **намеснік старшыні КДК Гродзенскай вобласці Таццяна СЛАБЫШ.**

Яна прыводзіць такі прыклад. У цэнтры аграгарадка Забалаць Воранаўскага раёна больш за 30 гадоў стаяў трохпавярховы даўгабуд. Аб'ект узводзіўся пад Дом культуры, але не быў рэалізаваны і страціў актуальнасць. Было вырашана яго знесці. Калі падлічылі, аказалася, што на спецыялізаваную тэхніку і работу адпаведнай арганізацыі спатрэбіцца 700 тысяч рублёў. Мясцовыя ўлады сумесна з сельгаспрадпрыемствам-уласнікам прыцягнулі да зносу спецыялістаў выбуховых работ. У лістападзе масіўны будынак быў ліквідаваны са значнай эканоміяй сродкаў. На гэтым месцы плануецца стварыць паркавую зону для правядзення масавых мерапрыемстваў.

Падобныя даўгабуды — гэта аб'екты пачатку 80-х гадоў. Іх будаўніцтва было пачата за бюджэтныя сродкі ў савецкі час у невялікіх населеных пунктах. Амаль усе яны належаць зносу.

А вось корпус абласнога лячэбнага цэнтра «Фтызіятрыя» ў Гродне будзе дабудаваны. Справа зрушылася з месца. Сёлета на дадзены аб'ект выдзелена 740 тысяч рублёў. Праект мяркуецца ўключыць у абласную інвестпраграму і на будучы год.

### НЕ ПАВЯЛІЧВАЦЬ ПЕРАЛІК

Як правіла, тэмпы скарачэння даўгабудаў у рэгіёне дасягаюцца за кошт «свежых» аб'ектаў, якім не больш як пяць гадоў. У КДК звяртаюць увагу на недасканалую работу ў гэтым годзе.

— Сёлета рывок па скарачэнні аб'ектаў незавершанага будаўніцтва паўтарыць не ўдалося. За дзевяць месяцаў па вобласці ліквідавана толькі 32 аб'екты. Гэта вельмі нізкія тэмпы ў параўнанні з той работай, якая была праведзена ў папярэдні перыяд, — тады лік ішоў на сотні. Аб'екты, як правіла, знаходзяцца на балансе абласнога цэнтра і райвыканкамаў. Некаторыя раёны сёлета наогул не прынялі ніякіх мер па іх скарачэнні, — рэзюмаваў Анатоль Дарожка.

У выніку ў вобласці зноў выраслa колькасць даўгабудаў, цяпер іх 110, з якіх больш за паўсотні — тыя, што дабавіліся ў гэтым годзе. У ліку прычын спецыялісты КДК называюць парушэнне тэрмінаў будаўніцтва, а таксама нізкія тэмпы асваення фінансавых сродкаў. Найбольш праблемнай у гэтым плане з'яўляецца сфера АПК. На яе прыпадае 40 % даўгабудаў.

У ліку складаных аб'ектаў незавершанага будаўніцтва ў Гродзенскай вобласці можна назваць рэканструкцыю ачышчальных збудаванняў у гарадскім пасёлку Воранава і Ашмянах, будаўніцтва двух жывёлагадоўчых комплексаў у Воранаўскім раёне, прыбудову да пажарнага дэпо ў Зэльве. Рэканструкцыя Дома культуры з басейнам у аграгарадку Верцялішкі Гродзенскага раёна таксама вядзецца з парушэннем графіка. У Астраўцы падобная сітуацыя склалася з упарадкаваннем паркавай зоны з мастамі і алеямі, кварталам сядзібнай забудовы, рэканструкцыяй бальніцы пад паліклініку.

— Пры наяўнасці бюджэтнага фінансавання рэканструкцыя бальніцы пад паліклінічны комплекс у Астраўцы вялася з парушэннем графіка. Увод быў запланаваны ў гэтым годзе, але графік сарваны. Пры праверцы было выяўлена завышэнне кошту і выканання работ на суму звыш 190 тысяч рублёў, — паведаміла Таццяна Слабыш.

Многія аб'екты знаходзяцца ў высокай ступені гатоўнасці. Сярод іх — рэканструкцыя і рамонт даху дзіцячага садка, а таксама будаўніцтва мемарыяльнага комплексу, прысвечанага героям Першай сусветнай вайны ў Смаргоні, кансервацыя замка Сапегі ў Гальшанах.

Некаторыя падыходы мясцовых улад выклікаюць здзіўленне ў спецыялістаў КДК. Напрыклад, у Шчучыне беспаспяхова імкнуцца прадаць праз аўкцыён былы калгасны зернесклад, які ў якасці гаспадарчай пабудовы калісьці будаваўся пры палацы Друцкіх-Любецкіх у Шчучыне. Аб'ект, мяркуючы па здымках, знаходзіцца ў аварыйным стане, значна разбураны. Дазвол на яго знос трэба атрымаць у Міністэрстве культуры. Пакуль будынак чакае новы аўкцыён з паніжэннем кошту.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**


**ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «ГомельГрааль»**

| Лот | Наименование Лота | Местонахождение | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона, BYN |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 350/С-196429 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-хозяйственное, общая площадь – 1901,1 кв. м) | Гомельская обл., г. Гомель, ул. Пригородная, 31 | 866 400,00 | 86 640,00 | 43 320,00 |
| Лот расположен на земельном участке с кадастровым № 340100000003003302, площадью 1,8006 га, назначение – для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании: расположен в водоохранных зонах рек и водоемов на площади 1,8006 га (код 2,4). Право постоянного пользования | | | | | |
| В отношении лота проводятся первые торги | | | | | |
| В отношении лота имеется ограничение (обременение) в виде заключенного договора аренды | | | | | |
| Дата и время проведения торгов | 22 января 2024 года в 12.00 (регистрация – с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1127 | | | | |
| Срок приема заявлений и оплаты задатка | с 10.00 19.12.2023 до 16.00 18.01.2024 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 | | | | |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту 1, ООО «ГомельГрааль», проводимых 22.01.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: 5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 14 (четырнадцати) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона.
6. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться к Дмитрию (+375336123939). Дополнительная информация по предмету торгов по тел. +375293082897, Анаида.**
7. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании действующего законодательства Республики Беларусь.
8. Государственная регистрация договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg |
| Продавец | ООО «ГомельГрааль», УНП 491328786 (246010, г. Гомель, ул. Пригородная, 31) в лице директора Цаповой Светланы Васильевны, тел. +375336123939 |

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» **(организатор аукциона)** по продаже имущества **ОАО «Коралл» (продавец)** извещает о проведении **29 декабря 2023 года открытого повторного аукциона со снижением на 50 %** в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9.

**Лот № 2:**
**Капитальное строение с инв. № 350/С-150587,** общей площадью **418,7 кв. м,** наименование –

**Здание бытовых помещений цеха № 11,**

расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Лепешинского, 7.

Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с 19.12.2023 по 28.12.2023 с 9.00 до 16.00.
Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы».

*Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 09.08.2023 г. № 152 (30032).*

**Контактные данные: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

УНП 400071204

**БРЕСТСКИЙ ФИЛИАЛ РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**

**Извещает о снятии Лота № 8 с аукциона по продаже имущества ОАО «Селекционно-гибридный центр «Западный», назначенного на 27.12.2023**

Телефоны для справок: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Извещение о продаже имущества ОАО «Селекционно-гибридный центр «Западный» опубликовано в газете «Звязда» от 08.12.2023

УНП 201028245

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,** организатор торгов по продаже имущества **ООО «Комповид»** (УНП 500221613), объявляет о проведении **29.12.2023 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 3 (75)

Андрэй ХУДЫК:

# «Патрэбны канкрэтныя дзеянні»

## Для пераадолення сусветнага кліматычнага крызісу

**Сусветны кліматычны саміт, які сабраў прадстаўнікоў больш як 150 краін свету, распачаў 28-ю Канферэнцыю бакоў Рамачнай канвенцыі ААН аб зменах клімату (COP-28), што праходзіла з 30 лістапада да 12 снежня ў ААЭ. У пленарным пасяджэнні саміту ўдзельнічала каля 90 першых асоб дзяржаў. Беларускую дэлегацыю ўзначальваў Аляксандр Лукашэнка, выступленне якога на саміце атрымала вялікі рэзананс.**

**А пра ход і вынікі канферэнцыі чытачам «Звязды» расказаў Андрэй ХУДЫК, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, намеснік кіраўніка беларускай дэлегацыі.**

Фота ўзята з сайта president.gov.by

***— Актуальнасць кліматычнага парадку дня ні ў кога не выклікае сумневу. Сваім прадстаўніцтвам гэта пацвердзіў і саміт, які прайшоў у Дубаі. Вы бачылі і чулі выступленні першых асоб. На чым яны засяроджвалі ўвагу?***

— Сапраўды, пытанні змен клімату знаходзяцца ў цэнтры ўвагі ўсёй сусветнай супольнасці. Шмат дзяржаў ужо сутыкнуліся з непапраўнымі наступствамі: засухамі, паводкамі, пад'ёмам узроўню сусветнага акіяна, ляснымі пажарамі, ураганамі, голадам і эпідэміямі. Нягледзячы на тое што Беларусь кліматычныя змены закранулі ў меншай ступені, кіраўнік нашай дзяржавы, разумеючы ўзаемасувязь кліматычных працэсаў у рэгіянальным і глабальным маштабах і іх непазбежны ўплыў на развіццё нацыянальнай і сусветнай эканомік, прыняў рашэнне заклікаць увесь свет да канкрэтных дзеянняў з трыбуны сусветнага кліматычнага саміту.

Выступленні кіраўнікоў замежных дзяржаў у асноўным нагадвалі самасправаздачы з мэтай схаваць сапраўдны стан рэчаў, а часам і ўвогуле сказіць рэальнасць. Так, асаблівае абурэнне, прымаючы да ўвагі сітуацыю ў Белавежскай пушчы, выклікала выступленне прадстаўніка суседняй краіны, які на ўвесь свет распавёў пра псеўдаклопат аб нацыянальных лясах. Лідары дзяржаў, якія прэтэндуюць на сусветнае панаванне, замоўчалі, што менавіта палітыка, якая праводзіцца іх краінамі, пагаршае кліматычную сітуацыю. Яны забыліся, што іх эканамічны дабрабыт асноўваецца як на актыўным выкарыстанні сваіх прыродных рэсурсаў, так і на разграбленні былых калоній. Заяўляючы на міжнародных пляцоўках пра неабходнасць рэзкага зніжэння выкідаў парніковых газаў, гэтыя панове не збіраюцца аказваць неабходную дапамогу тым краінам, куды яны вывезлі свае найбольш «брудныя» вытворчасці, каб забяспечыць уласным грамадзянам чыстае паветра.

І толькі наш Прэзідэнт у сваім выступленні дакладна і максімальна адкрыта абазначыў першапрычыны кліматычнай сітуацыі, якая складваецца: «Адсутнасць пачуцця меры, імкненне да геапалітычнай... перавагі тых, хто правакуе і распальвае ачагі войнаў; прага нажывы, якая ператварае прыродныя рэсурсы ў асабісты капітал і абкрадае наступныя пакаленні; спробы ўстараніць са сваёй дарогі краіны, якія перашкаджаюць падпарадкаваць увесь свет і разбурыць, выцягнуўшы з зямлі ўсе сокі».

У адрозненне ад прадстаўнікоў развітых краін, кіраўнік беларускай дзяржавы абсалютна дакладна вызначыў канкрэтныя фінансавыя механізмы па паляпшэнні кліматычнай сітуацыі: накіраваць грошы, якія цяпер ідуць на вядзенне вайны ў розных частках свету, на вырашэнне экалагічных праблем. Лічу, што менавіта таму прамова Аляксандра Рыгоравіча была сустрэта ўдзельнікамі пленарнага пасяджэння Сусветнага кліматычнага саміту стоячы, з апладысментамі.

Напрыканцы выступлення Прэзідэнт Беларусі заклікаў «усіх, хто абавязаны ўзяць на сябе цяжар гістарычнай адказнасці», да суразмернага ўнёску ў вырашэнне пытанняў кліматычнай бяспекі за стагоддзі бязлітаснай эксплуатацыі прыроды, павелічэння падтрымкі краін, якія развіваюцца, а таксама «перастаць выказваць «заклапочанасць» і пачаць дзейнічаць у імя захавання жыцця на Зямлі».

***— На папярэдняй канферэнцыі COP-27 было прынята рашэнне аб стварэнні фонду для кампенсацыі страт і шкоды ад кліматычных змен. Меркавалася, што развітыя дзяржавы будуць кампенсаваць наступствы змянення клімату для краін, якія развіваюцца. Ці ўдалося рэалізаваць гэтую прапанову?***

— Што датычыцца заснавання гэтага фонду, то ў ходзе Сусветнага кліматычнага саміту шэраг дзяржаў заявілі пра выдзяленне фінансавых сродкаў на агульную суму звыш 700 мільёнаў долараў. Найперш старшыня МОР-28 — Аб'яднаныя Арабскія Эміраты (100 мільёнаў долараў). На маю думку, заяўленыя абавязацельствы — важны элемент аднаўлення гістарычнай справядлівасці. Асноўная мэта заснаванага фонду — кампенсацыя краінамі, чыё індустрыяльнае развіццё прывяло да глабальнага пацяплення і ўвагнала планету ў кліматычны крызіс, тым дзяржавам, якія маюць нязначны вугляродны след, але сутыкаюцца са згубнымі наступствамі змен клімату. Шчыра спадзяюся, што зробленыя заявы будуць увасоблены ў канкрэтную дапамогу тым, хто мае ў гэтым патрэбу.

***— Чаму Канферэнцыя бакоў Рамачнай канвенцыі ААН аб змяненні клімату важная для Беларусі?***

— Удзел у такіх мерапрыемствах дазваляе нашай краіне прыстойна прадставіць вынікі ў прыродаахоўнай сферы, у дадзеным выпадку — змякчэнне наступстваў змянення клімату і адаптацыі да іх. У ходзе COP-28 Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тым, што наша краіна, згодна з Парыжскім пагадненнем, «у поўнай меры выконвае ўзятыя на сябе міжнародныя абавязкі і нават перавыконвае іх». Так, у 2021-м Беларусь скараціла выкіды парніковых газаў на 57,8 % з улікам сектара «землекарыстанне, змяненне землекарыстання і лясная гаспадарка», што ў 1,5 раза больш, чым узяты краінай абавязак да 2030 года. Кіраўнік нашай дзяржавы падкрэсліў, што «Беларусь аказвае бясцэнныя экасістэмныя паслугі нашаму кантыненту, захоўваючы ўнікальную крыніцу кіслароду — прыродныя балоты і лясы, лёгкія Еўропы». Такім чынам Беларусь робіць значны ўнёсак у агульную справу, разумеючы, што негатыўныя наступствы змянення клімату, якія пакуль толькі ўскосна закранулі нас, немінуча наступяць і на нашай зямлі. Сумесна з іншымі дзяржавамі мы выпрацоўваем новыя рашэнні праблемы змянення клімату, якія заснаваны на справядлівым размеркаванні адказнасці, а таксама актуальных умовах і патрэбах.

***— Наколькі насычанай была праграма беларускай дэлегацыі?***

— Традыцыйна такія маштабныя міжнародныя мерапрыемствы актыўна выкарыстоўваюцца для правядзення перагавораў на найвышэйшым узроўні. Парадак дня ў Аляксандра Рыгоравіча быў надзвычайна насычаным і напоўненым сустрэчамі з лідарамі сяброўскіх нам дзяржаў. Упэўнены, што зусім хутка мы ўбачым практычныя вынікі ад дасягнутых падчас перагавораў дамоўленасцяў.

Члены беларускай дэлегацыі таксама выкарысталі гэтую пляцоўку для правядзення шматлікіх двухбаковых сустрэч для абмеркавання перспектыў развіцця супрацоўніцтва. Напрыклад, з міністрам экалогіі і прыродных рэсурсаў Казахстана Ерланам Нысанбаевым мы абмеркавалі развіццё ўзаемадзеяння ў сферы абыходжання з адходамі, у тым ліку з пластыкам, а таксама вопыт Казахстана па кадыфікацыі прыродаахоўнага заканадаўства, удасканаленне функцыянавання аўтаматызаванай сістэмы маніторынгу атмасфернага паветра. Упэўнены, што гэтая сустрэча надасць новы імпульс беларуска-казахстанскаму супрацоўніцтву ў прыродаахоўнай сферы.

Адбылася і сустрэча з саветнікам Прэзідэнта, спецыяльным прадстаўніком Прэзідэнта Расіі па пытаннях клімату Русланам Эдэльгерыевым, у рамках якой мы намецілі шэраг перспектыўных напрамкаў далейшага супрацоўніцтва.

Абмяркоўваліся таксама пытанні, якія выходзяць за рамкі кліматычнага парадку дня. Так, з прадстаўнікамі Праграмы развіцця ААН мы закранулі новыя праграмы, у якіх можа паўдзельнічаць наша краіна; з генеральным дырэктарам Арабскай арганізацыі сельскагаспадарчага развіцця Ібрагімам Аль-Духейры намецілі шляхі рэалізацыі прыродаахоўнага кампанента сумеснай Дарожнай карты па супрацоўніцтве.

Падчас сустрэчы з прадстаўніком ЮНЕСКА члены беларускай дэлегацыі чарговы раз узнялі пытанне важнасці захавання трансгранічнага аб'екта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА «Белавежская пушча». Хачу адзначыць, што дзякуючы актыўнай пазіцыі і намаганням Мінпрыроды сёлета ў верасні Камітэт сусветнай спадчыны ЮНЕСКА на сваёй 45-й пашыранай сесіі разгледзеў стан захаванасці гэтага трансгранічнага аб'екта і звярнуўся да бакоў з просьбай запрасіць рэактыўную маніторынгавую місію ЮНЕСКА/МСАП на тэрыторыю Белавежскай пушчы. Чакаем, што гэты візіт будзе садзейнічаць захаванню ўнікальнага прыроднага комплексу.

**Андрэй КАРАБЕЛЬНІКАЎ.**

# Машыны не мыць, сцёкі не зліваць

## Што прадугледжана «ўказам для дачнікаў» у сферы землекарыстання

**Гаспадары зямельных участкаў у садаводчых таварыствах (СТ), якія не аформілі на іх дакументы, што сведчаць пра права ўладання, павінны зрабіць гэта цягам трох гадоў, інакш надзел могуць і канфіскаваць. Зменены падыходы да парадку фарміравання памераў членскіх узносаў у таварыствах і дадзена магчымасць перадаваць электрасеткі СТ у дзяржуласнасць. Шэраг удакладненняў з'явіўся і ў сферы землекарыстання і абыходжання з адходамі на тэрыторыі таварыстваў. Новаўвядзенні, прадугледжаныя Указам Прэзідэнта № 155 «Аб садаводчых таварыствах», уступілі ў сілу 2 снежня. Пра некаторыя асаблівасці па гаспадаранні на сваіх участках і ў межах агульнай уласнасці таварыства расказаў Максім ТАРАСАЎ, начальнік упраўлення рэгулявання обыходжання з адходамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

У частцы абыходжання з адходамі, напрыклад, было ўстаноўлена, што на тэрыторыі таварыстваў у агульнадаступных месцах павінны быць абсталяваны месцы для часовага захоўвання камунальных адходаў, якія можна бесперашкодна вывезці з тэрыторыі, а самі члены таварыстваў павінны беражліва ставіцца не толькі да аб'ектаў таварыства, але і прыроднага асяроддзя вакол яго, сцвярджае прадстаўнік Мінпрыроды:

— Ва ўказе, напрыклад, вызначана, што ў СТ павінна быць створана адна кантэйнерная пляцоўка на кожныя 70 і менш участкаў. А таксама адзін кантэйнер для змешаных адходаў на 30 і меней участкаў. У кожным таварыстве таксама павінен быць як мінімум адзін кантэйнер для збору другаснай матэрыяльнай сыравіны.

Для збору раслінных адходаў (лістоты, галін, травы, кустоў) і пры наяўнасці дагавора на кампаставанне ствараецца пляцоўка плошчай не менш за 6 м², якая з трох бакоў закрываецца агароджай вышынёй не менш як паўметра, і ставіцца кантэйнер аб'ёмам не больш чым 6 м³. Кампаставаць адходы члены СТ могуць і на сваіх участках.

Для збору буйнапамерных адходаў і смецця, якое ствараецца ў выніку будаўнічай дзейнасці, выкарыстоўваюцца спецыяльныя кантэйнеры-бункеры, кантэйнеры пад мультыліфт аб'ёмам звыш 6000 літраў ці абсталёўваюцца пляцоўкі.

У дакументе адзначаецца, што на зямельных участках не дапускаецца мыць аўто і іншыя транспартныя сродкі, зліваць гаспадарча-бытавыя сцёкавыя воды, вадкія камунальныя адходы.

— Для мойкі аўто ў нас ёсць стацыянарныя мыйкі, — падкрэсліў Максім Тарасаў. — Нават калі вы мыеце машыну ў сваім двары, вы можаце забрудзіць і глебу, і грунтавыя воды, якія цякуць не толькі пад канкрэтным участкам. У выніку гэта можа прывесці да забруджвання вады ваданосна гарызонту і тым самым забрудзіць ваду ў артэзіянскіх свідравінах і шахтавых калодзежах.

Увогуле, усе пытанні абыходжання з адходамі былі прыведзены ў адпаведнасць з палажэннямі ТКП 17.11-08-2020 «Ахова навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання. Адходы. Правілы абыходжання з камунальнымі адходамі», які зацверджаны пастановай Міністэрства ЖКГ і Мінпрыроды ад 30 чэрвеня 2020-га № 13/4-Т. Але іх вытрымліванне залежыць ад саміх людзей і іх сумленнага стаўлення да жыцця і прыроды.

**Ірына СІДАРОК.**

**Іван ПРЫХОДЗЬКА:**

# «ГРАМАДСКІЯ ЭКОЛАГІ І ІНСПЕКТАРЫ МІНПРЫРОДЫ — БОЛЬШ ЗА 60 ГАДОЎ ПОПЛЕЧ»

**Упершыню пры падтрымцы Праграмы ўдзелу на 2022—2023 гады, што фінансуецца ЮНЕСКА, на базе Рэспубліканскага цэнтра дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Мінпрыроды адбылася серыя семінараў «Павышэнне дасведчанасці грамадзянскай супольнасці па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя для дасягнення мэт устойлівага развіцця». У мерапрыемствах прынялі ўдзел прадстаўнікі прыродаахоўных ведамстваў Мінпрыроды, педагогі, грамадскія эколагі, супрацоўнікі экалагічных, краязнаўчых і турыстычных цэнтраў з усіх куткоў Беларусі.**

На ўрачыстым адкрыцці прысутнічалі **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Іван ПРЫХОДЗЬКА, дырэктар — галоўны рэдактар выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, намеснік дырэктара Дэпартамента па гуманітарнай дапамозе Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Сяргей КАЗЛОЎ і рэктар Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Ігар ВОЙТАЎ.**

Намеснік кіраўніка прыродаахоўнага ведамства **Іван ПРЫХОДЗЬКА** нагадаў словы Прэзідэнта Беларусі падчас пленарнага пасяджэння на Сусветным саміце па барацьбе са змяненнем клімату ў Дубаі пра лёсавызначальную важнасць аб'яднання намаганняў сусветнай супольнасці ў імя будучыні планеты Зямля. Вялікі ўклад у забеспячэнне экалагічнай бяспекі нашай краіны ўносяць грамадскія эколагі, якія ўжо больш за 60 гадоў дапамагаюць інспектарам Мінпрыроды, у першую чаргу, у ахове біяразнастайнасці, навядзенні парадку на зямлі, экалагічнай асвеце грамадзян, а таксама прымаюць удзел у рэспубліканскіх і рэгіянальных экалагічных каардынацыйных саветах.

*— Таму асабліва важна правядзіць абмен вопытам, укараняць новыя формы работы, удасканальваць агульныя падыходы да ўзаемадзеяння... Грамадскі эколаг павінен працаваць у адной звязцы з дзяржаўным інспектарам, а дзяржаўны інспектар са свайго боку абавязаны забяспечваць усёй неабходнай інфармацыяй, арганізоўваць навучанне і г. д. Цяпер пастановай урада ўводзіцца норма аб замацаванні грамадскага эколага за канкрэтным работнікам інспекцыі або камітэта. Пытанні аб пашырэнні паўнамоцтваў грамадскіх эколагаў, мерах стымулявання прапануем абмеркаваць пры падрыхтоўцы праекта Экалагічнага кодэкса, які будзе распрацоўвацца ў 2025 годзе.*

Таксама Іван Прыходзька заклікаў шукаць новых партнёраў накшталт прадстаўнікоў ПРААН, ЮНІСЕФ для рэалізацыі ініцыятыў, асабліва экаасветніцкіх. У якасці аднаго з такіх перспектыўных праектаў ён прапанаваў стварыць спецыяльны дадатак, у якім будзе адлюстравана інфармацыя, звязаная з прыцягненнем і навучаннем грамадскіх эколагаў. Пажаданне, каб ініцыятыўныя прадстаўнікі грамадства больш прымалі ўдзел у праектнай дзейнасці, прагучала і ў прамове **Сяргея КАЗЛОВА,** намесніка дырэктара Дэпартамента па гуманітарнай дапамозе Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ,** дырэктар — галоўны рэдактар выдавецкага дома «Звязда», нагадаў пра велізарную ролю кніг у выхаванні насельніцтва. Вобразнасць, якасная мастацкая мова, незвычайны фармат выкладання, прывабны дызайн не толькі прыцягваюць увагу, але і маюць вялікі ўплыў на свядомасць, у першую чаргу юных чытачоў. У якасці прыкладу кіраўнік выдавецкага дома расказаў пра яго прыродазнаўчую друкаваную прадукцыю: часопіс «Родная прырода», дадатак да газеты «Звязда» «Карані і кроны», дзіцячую мастацкую і публіцыстычную літаратуру. Матэрыялы, размешчаныя на іх старонках, могуць паказаць істотную дапамогу пры падрыхтоўцы і правядзенні розных экаасветніцкіх мерапрыемстваў.

Грамадскі эколаг **Юлія ПРЫЛІШЧ** падзялілася вопытам экаасветніцкай дзейнасці бабруйскіх калег. Так, з мэтай ахапіць як мага больш людзей рознага ўзросту ладзяцца своп- і экафестывалі «Дармаш», тэматычныя кіналекторыі, экалагічныя настольныя і звычайныя гульні і іншае. Іван Прыходзька высока ацаніў комплексны падыход, арыгінальнасць і разнапланавасць работы грамадскіх эколагаў Бабруйска:

*— Сёння з улікам запыту маладога пакалення на інтэлектуальную экалогію такія формы работы набываюць асаблівую значнасць. Думай глабальна — дзейнічай лакальна.*

Падчас мерапрыемства была арганізавана дыялогавая пляцоўка «Тэндэнцыі развіцця дадатковай адукацыі дарослых, уключаючы навучанне грамадскіх эколагаў з мэтай рэалізацыі прынцыпу галоснасці і ўліку грамадскай думкі пры правядзенні дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, стратэгічнай экалагічнай ацэнкі і ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе».

Напрыканцы дыялогавай пляцоўкі быў падпісаны Дагавор аб супрацоўніцтве паміж Рэспубліканскім цэнтрам дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Мінпрыроды і Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэтам.

## Тэорыя і практыка

Праграма кожнага семінара разлічана на два дні. Першы быў прысвечаны ўдасканаленню ведаў у галіне прыродаахоўнага заканадаўства. Разглядаліся прававыя асновы ўдзелу грамадства ў прыняцці рашэнняў, звязаных з навакольным асяроддзем, прыродакарыстаннем, складаныя аспекты розных нарматыўных дакументаў, якія рэгламентуюць пытанні аховы жывёльнага і раслiннага свету, паверхневых і падземных вод, абыходжання з адходамі. Апрача таго, удзельнікі семінара распачалі дыскусію аб праблемах супрацоўніцтва з рознымі прыродаахоўнымі ўстановамі, сартавання смецця, алгарытмы атрымання дазволаў на вынятку з прыроды аб'ектаў жывёльнага свету і інш. Напрыклад, адно з пытанняў датычылася ўзаемадзеяння з дзяржаўнымі ведамствамі ў рамках выканання навукова-даследчых работ, праектнай дзейнасці і дзяржаўных праграм: у якой установе (лясгасе, раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, райвынканкаме і інш.) патрэбна прасіць дазвол на наведванне лясоў у пажаранебяспечны перыяд, калі ўваход туды прадыктаваны неабходнасцю падрыхтаваць пэўную справаздачу для праекта.

*— Такія семінары вельмі карысныя. Яны дазваляюць, па-першае, абнавіць веды па адпаведнай тэме, па-другое, абмяняцца вопытам з калегамі, у тым ліку па абыходжанні з адходамі. Напрыклад, хтосьці займаецца ўтылізацыяй кандэнсатараў. Цікава пагутарыць, якую колькасць атрымалася вывезці, якія арганізацыі прымаюць у гэтым удзел. Па-трэцяе, гэта выдатная магчымасць наладзіць супрацоўніцтва з прадстаўнікамі неабыякавай грамадскасці,* — падзяліўся поглядам **кіраўнік аддзела кантролю абыходжання з адходамі Брэсцкага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Мікалай ПАЛЯНЧУК.**

Прыкладна гэтаксама лічыць **Вольга ЖАЛЕЗНАЯ, настаўніца хіміі, кіраўнік праекта «Зялёныя школы» Люсінскай сярэдняй школы імя Я. Коласа Ганцавіцкага раёна:**

*— Смецце — гэта бяда. Нашы людзі не ведаюць, чаму яго трэба сартаваць. Кажуць, а які сэнс, калі зранку прыязджае смецявоз і забірае ўсё ў адзін кантэйнер. Насамрэч такіх бакаў чатыры... Трэба паказваць, тлумачыць. Асабліва наконт адходаў з падворкаў. Я праводжу заняткі, майстар-класы па сартаванні адходаў для дзяцей, іх бацькоў і жыхароў нашага раёна. Таму хацелася б даведацца больш глыбока пра нарматыўныя прававыя акты ў гэтай галіне, аднак стрымлівала мудрагелістая юрыдычная мова. А цяпер гэта праблема вырашана.*

У другі дзень заняткі праводзіліся на базе Бярэзінскага біясфернага запаведніка (Віцебская вобласць). Яго супрацоўнікі распавялі пра свой вопыт работы па захаванні, вывучэнні і рацыянальным выкарыстанні прыродных комплексаў. Апрача таго, для ўдзельнікаў семінара быў праведзены майстар-клас экаасветніцкай экскурсіі ў Музеі прыроды і лясным заапарку. Многім, асабліва настаўнікам агульнага сярэдняга ўзроўню і выхавальнікам дадатковай адукацыі, спадабаўся экалагічны адукацыйны пункт, які ладзіцца ў рамках праекта «Зялёная школа».

Экалагічны адукацыйны пункт складаецца з аўдыторый для тэарэтычных заняткаў са спецыяльным тэхнічным абсталяваннем у Доме экалагічнай асветы і двух экалагічных маршрутаў з месцамі назірання за дзікай прыродай. Гэты праект дае дзецям магчымасць на практыцы і ў нязмушанай гульнявой абстаноўцы прымяніць тэарэтычныя веды ў галіне прыродазнаўства, атрыманыя ў школе.

**Наталля САЛАГУБ, намеснік дэкана факультэта прыродазнаўства па навуковай рабоце, навуковы кіраўнік маладзёжнага рэсурснага цэнтра Green Office BSPU,** падзялілася ўражаннямі:

*— Лічу выезды на прыроду добрым дадаткам да практычных заняткаў. Гэта сапраўдная матывацыя, тое, дзеля чаго мы вядзём барацьбу за навакольны свет. Што датычыцца тэарэтычнай часткі, то няведанне закона не вызваляе ад адказнасці. Мы вельмі шмат працуем з навучэнцамі, настаўнікамі, установамі адукацыі. Атрыманая інфармацыя пра некаторыя аспекты аховы жывёльнага і раслiннага свету, абыходжання са смеццем, іншыя складаныя нарматыўныя нюансы дазваляе цяпер больш абгрунтавана адказваць на ўсе пытанні.*

Напрыканцы семінара кожны ўдзельнік стаў уладальнікам брашуры з інфармацыйна-аналітычнымі матэрыяламі вучэбных прэзентацый і лекцый. У асноўным гэта вытрымкі з законаў і пастаноў, якія могуць быць выкарыстаны грамадскім эколагам у яго паўсядзённай рабоце. Матэрыялы закліканы садзейнічаць прапагандзе і фарміраванню ў насельніцтва беражлівага стаўлення да прыроды, развіцця экасвядомасці, пашырэнню сеткі грамадскіх эколагаў.

Таму місія семінара не толькі ў павышэнні дасведчанасці грамадзянскай супольнасці па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя і абмене досведам. Галоўная задача — наладзіць кантакты. Сабраць у адным месцы школьных настаўнікаў і метадыстаў цэнтраў дадатковай адукацыі, грамадскіх эколагаў і экспертаў сістэмы Мінпрыроды, супрацоўнікаў заказнікаў і турыстычных устаноў. Пазнаёміць між сабой, даць інструменты рэалізацыі ініцыятыў і разам ісці да будучыні.

**Александрына ПАРШЫНА.**
**Фота аўтара.**

# ...АДНОЙЧЫ МОВА ПРАРАСТАЛА

**Тыражом 2500 экзэмпляраў пабачыла свет кніга выбраных твораў лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Алеся Разанава (1947—2021) «З маланкаю ў сэрцы».**




Болей як два гады няма з намі паэта, які ўжо з першых сваіх кніг (у 1970 годзе быў выдадзены яго зборнік «Адраджэнне», яшчэ праз тры гады — кніга «Назаўжды») заявіў аб сабе як паэт-наватар. «...Хоць тыя дваццаць пяць вершаў, што склалі кнігу «Адраджэнне», былі, па сутнасці, вельмі сугучнымі рамантычнаму светаадчуванню тагачаснага маладога пакалення, творчасць А. Разанава ўражвала сваёй памкнёнасцю і дзёрзкасцю, той апантанасцю, з якой паэт услаўляў подзвіг, дзеянне, рух» (Ганна Кісліцына).

Новая кніга, якую ўклалі доктар філалагічных навук Ганна Кісліцына і жонка паэта Галіна Разанава, была спярша задумана як том выбранага і сабрана самім паэтам у 2019 годзе. З прадмовы Г. Кісліцынай «Класік беларускага авангарда» да выдання, якое мы зараз маем шчасце трымаць у руках: «З маланкаю ў сэрцы» — так павінен быў называцца том выбранага, які ўклаў сам паэт у 2019 г. Назва супадае з радком з аднаго з разанаўскіх версэтаў, але значна шырэйшая за яго змест. Бо маланка — гэта і паэтычная метафара той энергіі, якая злучае ў творчасці паэта зямлю і неба, быццё і небыццё, і метафара тых выпрабаванняў, якія выпалі на яго долю. Здаецца вельмі важным, каб чытачы маглі ацаніць творчасць Алеся Разанава, кіруючыся яго ўласнымі ўяўленнямі пра тое, якія з яго твораў з'яўляюцца найбольш істотным здабыткам для айчыннай літаратуры. У гэту анталогію ўвайшло не ўсё адабранае — у тым рукапісе было каля 1200 старонак, — але асноўныя кірункі яго творчых пошукаў у кнізе, якую вы трымаеце ў руках, прадстаўлены. На наш погляд, яны даюць поўнае ўяўленне, чаму Алеся Разанава называлі класікам беларускага авангарда, бо краевугольнай ідэяй авангарда, нагадаем, з'яўляецца выйсце за межы вядомага ў невядомае і нават непазнавальнае».

«З маланкаю ў сэрцы» адкрываецца вершам, які быў створаны ў 1965 годзе, — «Мова»: *«Празрысты звон, / грымотны грукат, / скалісты свіст, / магутны гул — / усе / разрозненыя гукі/ цяклі, / каб зліцца / у агул. / Хісталі / ўздыбленыя далі, / глыбаста білі ў небасхіл. / І ў немату не прападалі, / а западалі / і раслі. / І ціш і гром, / і звон і шорах / спляліся / ніткаю радства, / калі з грудзей, / нямых і чорных, / аднойчы/ мова прарасла».*

Падаецца, што ўсе памкненні, усе, на першы погляд, самыя складаныя мастацкія і філасофскія, проста жыццёвыя вышукі Алеся Разанава былі скіраваны на ўмацаванне таго моста, што злучае традыцыі з вечнасцю, з будучыняй. Наш вялікі сучаснік Алесь Разанаў і далей будзе прачытаным і зразумелым не толькі для новых пакаленняў беларусаў. Такой упэўненасці дадаюць і заключныя разанаўскія радкі з кнігі «З маланкаю ў сэрцы», якая выйшла ў мінскім выдавецтве «Папуры»: «Мэта паэтычнай творчасці — вершы, а метамэта — у выйсці... У выйсці з абмежаванасцяў, з якімі зрошчана і зроднена асабовасць, у боскія абсягі. Вершы — сляды ў паднябессі ці, калі ўдакладняцца, сляды з паднябесся».

Давайце паспрабуем пайсці следам за яркім мастаком слова, паспрабуем зразумець і адкрыць штосьці сутнаснае, што гучыць, што закладзена ў яго вершах, паэмах, пункцірах, версэтах, вершаказах, квантэмах, зномах.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# НОВАЕ — У КРАЯЗНАЎЧАЙ ПУБЛІЦЫСТЫЦЫ

**Нядаўна ў рады Саюза пісьменнікаў Беларусі прынялі вядомага ў краіне чалавека, прадпрымальніка Міхаіла СУПРУНОВІЧА. Прынялі па секцыі публіцыстыкі за кнігу «Спяшайцеся рабіць дабро». І вось да чытача прыйшла яго новая кніга — «Новыя Навасёлкі».**

Літаратар простымі словамі, шчыра і пранікліва расказвае пра сваю родную вёску — Новыя Навасёлкі Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Прыгожа афармленае, выкананае на высокім мастацкім, паліграфічным узроўні выданне пабачыла свет у мінскім кніжным выдавецтве «Форум».

З прадмовы Міхаіла Супруновіча да сваёй сапраўды спавядальнай працы, якая з'яўляецца працягам яго шчырага, сардэчнага стаўлення да роднага паселішча праз дзейсныя справы, праз падтрымку жыцця ў гомельскай глыбінцы: «У сваёй кнізе ўспамінаў «Спяшайцеся рабіць дабро» (Мінск, 2021) я прывёў сведчанні з энцыклапедыі пра тое, што мая родная вёска Новыя Навасёлкі існуе з пачатку 1920-х гадоў, а размешчаныя поруч Навасёлкі (старыя), адкуль і выйшлі нашы прашчуры, вядомыя з канца XVIII стагоддзя. Аднак пасля дадатковай




працы ў архівах высветлілася, што Новыя Навасёлкі былі адбудаваны ў 1939 годзе, а Навасёлкі ля рэчкі Іпа згадваюцца пад 1552 годам. Гэта стала адной з прычын, па якой я вырашыў працягнуць свае даследаванні і аповед пра нашу малую радзіму. Узіраючыся ў глыбіню стагоддзяў, бачу, што ў гісторыі гэтых вёсак, як у люстэрку, адбіты няпросты, велічавы, шматпакутны і гераічны лёс усяго беларускага народа. Гэта і вызначыла характэрныя рысы навасёлкаўцаў: адкрытасць і добразычлівасць, працавітасць і трываласць у баі з ворагам, здольнасць пераадольваць цяжкасці і спачуванне да чужой бяды. З пражытымі гадамі па-сапраўднаму думаеш і разумееш, наколькі дарагія табе бацькоўская хата, вуліца, рэчка, палеткі і лес за ваколіцай, дзе прайшлі тваё дзяцінства і юнацтва...»

Кніга «Новыя Навасёлкі» складаецца з двух асноўных раздзелаў — «Зямля і людзі»

і «Другая маладосць прыходзіць да тых, хто першую збяро́г». Аўтар кнігі выбраў сваю ўласную манеру знаёмага і адкрытага, занатаванага ім матэрыялу пра жыццё вяскоўцаў. Як упарты даследчык-шукальнік Міхаіл Супруновіч ідзе па роднай вёсцы. Ад адной хаты да другой, нікога не мінае. Гэта для нас, чытачоў, такое падарожжа з'яўляецца віртуальным, а публіцыст падышоў да кожнага дома, сустрэўся з яго насельнікамі, зазірнуў у сямейныя альбомы, спярша выслухаў, а следам і распытаў пра саміх суразмоўцаў, пра змены ў іх жыцці за апошнія дзесяцігоддзі, усё, што здолелі яны ўспомніць, занатаваў і з жыцця іх папярэднікаў, блізкіх людзей. У кнізе нязмушана выкладаецца сацыяльна-побытавая гісторыя кожнай сям'і, а значыць разам тчэцца адзінае палатно жыцця вёскі Новыя Навасёлкі праз многія гады. «Гісторыя Новых Навасёлак, створаных у пярэдадзень Вялікай Айчыннай вайны, у трэцім дзесяцігоддзі новага XX стагоддзя, вырастала з гісторыі краіны і чалавечых лёсаў, — піша Міхаіл Андрэевіч. — Уласна кажучы, жыццё нашых вяскоўцаў — і ёсць гісторыя самой вёскі. Вёскі, якой яшчэ няма і стагоддзя. Сяляне з вуліцы Сялянскай! Праўда, яшчэ пару чалавек інтэлігенцыі, выхадцаў з нашых жа сялян. У аснове ўкладу жыцця — хрысціянскія каштоўнасці, сэнс і сутнасць усяго існавання. І ўсё ж, якімі б падобнымі ні былі чалавечыя лёсы, кожны — унікальны. Што ні хата, то свой непаўторны свет...»

У нашым віртуальным падарожжы па Новых Навасёлках дапаможа багаты ілюстрацыйны матэрыял. Фотаздымкі суправаджаюць аўтара ва ўсіх сустрэчах з землякамі. Міхаіл Андрэевіч распытвае людзей, размаўляе з імі каля падворкаў і каля іх хат, разам ідзе па роднай вёсцы, выслухоўвае не толькі іх цяпер ужо гістарычныя згадкі, але і занатоўвае іх сённяшнія клопаты. А як цікава разглядаць старыя здымкі перадавікоў 9-й пяцігодкі (1971 — 1975) брыгады в. Новыя Навасёлкі саўгаса «Каплічы»! Адкрытыя, шчырыя твары землякоў — даярак, цялятніцы, трактарыста, шафёра, газаэлектразваршчыка і нават мужчыны-дояра. Цяпер ужо ніхто і не згадвае такую форму ідэалагічнай, выхаваўчай працы з людзьмі. Хіба што яшчэ ў райцэнтрах і ў буйных прамысловых калектывах вісяць Дошкі гонару... А між тым, шкада. Людзям заўсёды патрэбна ацэнка іх працы...

Многія дэталі з успамінаў землякоў Міхаіла Супруновіча варта прачытаць сённяшнім дзецям, школьнікам, хаця б дзеля таго, каб паспрабаваць зразумець, які шматпакутны і доўгі шлях пройдзены беларусамі да сённяшняга дабрабыту. З успамінаў стрыечнай сястры аўтара — Марыі Іванаўны Шэлег: «...Падзеі сіроцкага дзяцінства з гадамі сціраюцца ў памяці, блытаюцца перыяды, што і за чым ішло. Жылі мы з братам Васілём пасля смерці бацькоў у дзеда Іосіфа. Але памерла бабуля Домна. І дзед узяў, як гаварылі ў той час, другую жанчыну. Яна была другой ва ўсім. Нас адправілі ў дзіцячыя дамы. Мяне ў Даманавіцкі (здаецца, гэта была вялікая вёска Камуна), а брата, паколькі ён быў яшчэ дашкольнікам, у дзетдом у Мазыры. І так атрымалася, што нас раздзялілі з ім надоўга.

Там я вучылася. Гэта быў прыкладна 1946 год. Мы знаходзілі бульбяныя лупіны на сметніцы: калі мылі, а калі і нямытымі наклеім іх на гарачыя дзверцы пячуркі-грубкі, яны крыху падпякуцца і ядзім.

Памятаю, дадуць кавалак хлеба на тыдзень, пакладзеш у кішэню, а пасля шчыкаеш па крошках, толькі б голад крыху заглушыць. Летам лягчэй было. Ягады, траву елі. Нацягаем сцяблін аеру, ён тоўсты, сакавіты. Так і выжывалі. Нават памятаю суп з чарвякамі, гарохавы, здаецца. Елі, а што было рабіць? Вакол бедната. Людзі з зямлянак толькі выбіраліся...»

У кнізе — і этнаграфічныя дэталі, і згадкі пра вясковыя мянушкі. Вельмі цікавым падаецца расповед вясковай настаўніцы Валянціны Аляксееўны Ус. Сталага веку жанчына не проста ўспамінае, а параўноўвае часіны, дзеліцца звычайнымі, здавалася б, фактамі, а разумееш, што праз іх мы атрымліваем крынічную, шчырую інфармацыю пра тыя ці іншыя сацыяльныя, грамадскія з'явы, пра тое, што ўплывала і працягвае ўплываць на развіццё грамадства. І ў папярэднія дзесяцігоддзі, і ў сённяшнія дні.

Якраз гэта і прыцягвае ў кнізе Міхаіла Супруновіча «Новыя Навасёлкі» — спавядальнасць, шчырасць, адкрытасць яго суразмоўцаў, надзвычайнае жаданне публіцыста разгаварыць землякоў. Веданні самога аўтара і яго блізкіх людзей, проста аднавяскоўцаў паказваюць узровень грамадзянскага стаўлення да жыцця не толькі ў адной далёкай і невядомай для большасці чытачоў вёсцы на Гомельшчыне, у Калінкавіцкім раёне, а яшчэ і ўзровень стаўлення да сацыяльных, грамадска-палітычных працэсаў. У тэксце прысутнічае галоўнае — тое, што спрыяе чалавеку заставацца чалавекам.

Міхаіл Супруновіч не просты летапісец, публіцыст-аглядальнік вясковага жыцця, ён яшчэ і актыўны дзеяч у справе падтрымання жыцця ў Новых Навасёлках, захавання памяці пра сваю вёску-радзіміцу. Літаратар пражывае аднымі клопатамі з людзьмі, з якімі ці то сам даўно знаёмы, ці то яны з'яўляюцца дзецьмі, унукамі яго даўніх суседзяў.

Можна смела, без перабольшвання, заўважыць, што створаная М. Супруновічам кніга — добры ўзор краязнаўчай публіцыстыкі, напамін многім гараджанам, што выйшлі яны з вёскі, што проста абавязаны нешта вартае зрабіць для захавання Вясковай Атлантыды, а значыць — і нашай роднай Айчыны, нашай Беларусі.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

# «ПОЎРУБЕЛЬ» ЗА СОНЦА

## Таямніцы зборніка «Жалейка»

*«Я не паэта,*
*о крый мяне Божэ!»*
*Не рвуся я к славе гэткай*
*ні мала,*
*Хоць песеньку-думку*
*і высную можа,*
*Завуся я толькі —*
*Янка Купала».*

Так гучаць першыя радкі першага зборніка самага вядомага беларускага паэта, які стаў брэндам Беларусі.

Што ж, гэта было ў духу яго часу, і гучыць, калі разабрацца, зусім не прыніжальна: не я пяю — народ, не я складаю — нешта вышэйшае за мяне гаворыць праз мае вусны, праз мае радкі...

Сёлета мы адзначаем 115 гадоў з выхаду зборніка Янкі Купалы «Жалейка». З'явіўся ён на свет у Пецярбурзе ў 1908 годзе, увесну. Мог раней: настаўнік Янкі Купалы Уладзімір Самойла клапаціўся пра выхад першай кнігі маладога паэта ў Мінску ў 1907-м, не атрымалася. А рэклама першага купалаўскага зборніка ішла ўжо ў 1906-м.

Наклад, як усе пішуць, быў сціплы. Але гледзячы з чым параўноўваць. Вядома, у савецкія часы творы класікаў, таго ж Купалы, выходзілі мільёнамі асобнікаў. А на сёння 4300 экзэмпляраў для паэтычнага зборніка, а менавіта такім тыражом выйшла «Жалейка», — прыстойны наклад, нават паспяховы. У гэты час Купала пасля трох гадоў цяжкой працы на бровары ўладкаваўся бібліятэкарам у прыватную бібліятэку «Веды» Даніловіча ў Вільні, супрацоўнічаў з «Нашай Нівай». Ужо ў першым зборніку шмат твораў, якія сталі праграмнымі — «Я не паэта», «Я — мужык-беларус», «Шумныя бярозы пабяліў мароз». Але самым вядомым вершам, безумоўна, стаў «А хто там ідзе?», перакладзены на 101 мову свету.

Юбілей гэтай сціплай звонку, але неверагодна важнай кнігі, якую прадавалі цаной у паўрубель — знакавая падзея. З гэтай нагоды прайшло шмат мерапрыемстваў, адбылося шмат публікацый, у тым ліку на старонках «Звязды». Давайце сёння ўспомнім некаторыя цікавыя агучаныя факты. І адметна, што многія з іх датычацца... тэмы падвойнасці.

### Дзве вокладкі: пекная чэрпаная папера і «этнаграфічны варыянт»

У «Жалейкі» было два варыянты: звычайны і палепшаны, на добрай паперы. Як паведамлялі выдаўцы, «Жалейка» — Янука Купалы (цана на простым паперы 50 кап., а на лепшай — 80 кап.)». Прычым факсімільнае выданне «Жалейкі», якое з'явілася ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў 1982 годзе, паказвае нам таннае выданне — хоць у яго ёсць малюнак на вокладцы: задуменны бялявы хлопчык з жалейкай на фоне вясковага пейзажу, а ў дарагім варыянце на вокладцы малюнка няма, толькі сціплы арнамент. Як зазначае даследчык Мікола Трус, «дзякуючы факсімільнаму выданню 1982 года ў агульнай чытацкай свядомасці зафіксаваўся больш танны, этнаграфічны варыянт зборніка — з выявай музыкі на фоне далёкіх краявідаў». Мікола Трус адносна «дваякасці»

кніг прыводзіць таксама рэкламны тэкст «Таннае выданне на добрым белым паперы ў вокладцы»; «Дарагое на пекным чэрпаным паперы, у пекнай з беларускім узорам вокладцы».

### Два імені: нараджэнне Янкі

Ці звярнулі вы ўвагу, што ў абвестцы выдаўцоў імя аўтара значыцца як «Янук Купала»? Янка — гэта ж насамрэч жаночая форма імя Янук. З таго часу як 15 мая 1905 года ў мінскай газеце «Северо-Западный край» быў надрукаваны верш «Мужык», Купала падпісваўся менавіта «Янук Купала». Шмат у якіх крыніцах можам прачытаць, што Янкам паэт стаў менавіта з выхаду зборніка «Жалейка»: нібыта Браніслаў Эпімах-Шыпіла, адзін з лідараў беларускага руху ў Санкт-Пецярбургу, які быў рэдактарам зборніка, такім чынам выпадкова памыліўся. Аднак перачытаем першы верш зборніка, дзе сем разоў паўтараецца рэфрэн з імем паэта: «Завуся я толькі — Янка Купала», «Ат ведама з вёскі — Янка Купала» і гэтак далей. Наўрад сем разоў папраўленае слова ў адным вершы можна назваць выпадковай памылкай. Хутчэй за ўсё, рэдактара не задаволіла немілагучнасць, якая атрымліваецца пры сутыччы дзвюх літар «к» у «Янук Купала», і тое, што пры гэтай форме ў радку парушаецца рытм. Так і з'явіўся «Янка Купала».

### Два рэцэнзенты: адна колернасць або сонца

На «Жалейку» адразу ж з'явіліся рэцэнзіі. Прычым дужа кантрасныя. Самая першая — Ядвігіна Ш. у газеце «Минское эхо». Да апошняга часу тэкст яе быў невядомы, але Мікола Трус знайшоў сканаваную копію нумара ад 9 ліпеня 1908 года з рэцэнзіяй у фондах Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі ў Маскве. Вось што піша рэцэнзент: «Лепш быць першым у вёсцы, чым другім у Рыме», — вось першае, навязлівае, уражанне пры чытанні новаспечанага даволі аб'ёмістага (152 стар.) томіка беларускіх вершаў Янкі Купалы пад агульным загалоўкам «Жалейка». І калі мары беларусаманаў — уваскрэсіць і даць літаратурную абалонку паміраючаму беларускаму дыялекту — наканавана ажыццявіцца, то паміж піянерамі гэтай ідэі адно з першых месцаў зойме бясспрэчна Янка Купала... Жыццё беларуса занадта манатоннае, і мы не павінны таму быць асабліва патрабавальныя ў разнаколернасці яго народнага паэта».

Згадзіцеся, даволі з'едлівыя трапляюцца інтанацыі. Ці не таму Уладзімір Самойла, аўтар іншай рэцэнзіі, надрукаванай пад псеўданімам Уладак з Казіміраўкі, не шкадуе ўхвалаў: «Толькі нядаўна над цёмнай і пахмурнай Беларуссю сталі крыху расхадзіцца хмары, вузенькі луч свету і цяпла пачаў ліцца ў змучаную душу мужыка-беларуса. Такі дачакаў народ наш сваіх «пячальнікаў». Да гэтых


№ 6.
„Загляне сонцэ и У нашэ ваконцэ!"
Жалейка
Янки Купалы.
Грай, мая жалейка,
Пей, як салавейка!
Апевай нядолю,
Апевай няволю,
И грымни свабодна,
Што жыве край родны.
Янка Купала.
ПЕЦЯРБУРГ.
Друкарня К. Пянткоўскага, Вялик. Пад'ячэская вул. № 22.
1908.

«пячальнікаў» беларускага народа належыць перш-наперш малады пясняр Янук Купала... Песні Купалы — гэта люстра, у каторым свеціцца душа беларуса, яго жыццё, яго родны край; гэта праўдзівы, непадроблены голас, што выходзіць з самай глыбі народнай душы... І хто раней не верыў, каб беларускі народ мог прачнуцца і пайсці сваёй уласнай дарогай, той цяпер мусіць прызнаць, што беларусы яшчэ не ўмёрлі, яшчэ маюць сілу жыць і развівацца, што ўжо самі яны «нясуць сваю крыўду на свет цэлы», захацелі «людзьмі звацца».

У другой сваёй рэцэнзіі Самойла сцвярджае: «Сонца жывой, сапраўднай паэзіі заглянула ў ваконца цёмнай, беднай, але вялікай хаты беларускага народа!»

### Два арышты: «сведений о нем в комитете не имеется»

Сам Купала так успамінаў пра той час: *«Якія былі ўмовы друкавання? Першы мой зборнік «Жалейка» выдадзены ў 1908 годзе беларускай выдавецкай суполкай «Загляне сонца і ў наша аконца». Пасля выхаду кніжка была канфіскавана, а выдаўцы былі судовай палатай прыцягнуты да адказнасці. Толькі пасля вялікіх клопатаў удалося зняць канфіскацыю. А ў 1909 г. у Вільні кніжка была ў другі раз канфіскавана па распараджэнню віленскага генерал-губернатара».*

Захавалася прадстаўленне Пецярбургскага камітэта па справах друку пракурору Пецярбургскай судовай палаты ад 4 лістапада 1908 года аб забароне і арышце «Жалейкі»:

«В С.-Петербургский комитет по делам печати поступила брошюра на белорусском наречии (напечатанная русским шрифтом) под заглавием «Жалейка» (Дудочка) Янки Купалы, издательство «Загляне сонца і ў наша ваконца» № 6, цена 50 коп., КРД п. л., 4300 экз., типография К. Пянтковского (Большая Подьяческая).

...Во всех произведениях Янки Купалы (за исключением нескольких переводных) описывается тяжелая, полная лишения и труда жизнь белорусского крестьянина. Упорный беспросветный труд и вместе с тем хроническое недоедание, болезни, холод, словом, неизбывная нищета — вот основная нота, властно звучащая в стихотворениях Купалы. Сравнивая жизнь крестьянина с тем, как живут помещики, чиновники и другие, Янка резко нападает на современный несправедливый, по его мнению, порядок вещей, при котором может иметь место, с одной стороны — праздная и в то же время сытая и обеспеченная жизнь одних людей, с другой — труженическая и, несмотря на это, полная нужды и лишений жизнь крестьян. Глубоко скорбит автор и о том, что народ не пользуется той свободой, при которой жизнь его не могла бы быть так несчастна и безотрадна...»

Два вершы прызнаныя ўвогуле злачыннымі, супраць Янкі Купалы просяць узбудзіць судовае пераследванне, праўда, «сведений о нем в комитете не имеется».

### Два «Шаўцы»: з гісторыі памылак

Сваю рэцэнзію на «Жалейку» Ядвігін Ш. завяршае так: «Колькасць памылак у выданні цалкам зразумелая і выбачальная». У канцы зборніка пералік памылак займае чатыры старонкі. Найчасцей памылкі надараліся з-за асаблівасцяў беларускай мовы, якіх друкары не ведалі. Хоць «у» кароткае ў тэксце ўжываецца, замест «і» беларускага стаіць «и» рускае, «ё» перадаецца спалучэннем «йо» («вйоска», «йон»). Карацей, звыклыя правілы не дзейнічалі. Таму сярод памылак — замест «песенку-думку» прапануецца чытаць «песеньку-думку», замест «вочи» — «вочы». Ёсць памылкі, якія не адразу зразумееш. Дзіўны «Долюб» у арыгінале гучыць як «Долю», «Гюблю» — «Люблю», «жеже» — «жджэ», «Сцэопки» — «Сцйопки», то-бок «Сцёпкі». Зразумела, піцерскі наборшчык, які набраў «Рэзак і нарогі», наўрад адрозніваў гэта ад «От, рэзні-нарогі», як належыць у арыгінале. Ну і самая заўважная памылка зазначаецца выдаўцамі напачатку:

*«Просім выбачыць, што праз недагляд верш «Шавец» знайшоўся тут выдрукаваным два разы: на стр. 40 і 118».*

*«Я шавец-маладзец,*
*Знаю дзела сваё,*
*Слухаць мусяць мяне*
*Капылы і скур'ё».*

### Два паэты: як Купала стаў Багушэвічам

Зборнік «Жалейка» адразу набыў вядомасць шырэйшую, чым толькі ў свядомых беларускіх колах. Зборнік перадалі Максіму Горкаму, ён асабліва ўпадабаў верш «А хто там ідзе» з дададзенымі нотамі, палічыўшы беларускім гімнам. А яшчэ адзін выпадак апісвае ў сваіх успамінах беларускі дзеяч Яўген Хлябцэвіч. У канцы 1909 года кнігавыдавецтва «Разум» выпусціла ў Пецярбургу «Альманах-каляндар для ўсіх» на 1910 год. Там было змешчана «Чытанне


Я не паэта.

Я не паэта, о крый мяне Божэ!
Ня рвуся я к славе гэт'кай ни мала.
Хоць песенку-думку и высную можэ,
Завуся я тольки—Янка Купала.
Славу паэтаў разносяць па свеце,
Вянки ўскладаюць и звоняць пахвалай,
Я ж циха йграю, хтож цихих прымеце?
Ат! ведама з вйоски—Янка Купала!
Кожны край мае тых, што апеваюць,
Чым йосць для народа упадак и хвала,
А Беларусы никогаж не маюць,
Нихай жэ хоць будзе Янка Купала.
Доляй убоги йон цихи, ня смелы,
Беда, яго маци, узгадавала,
Слйовы пагарды пье тольки век цэлы,
От, ведама, просты Янка Купала.
Песни начаў пець тэй мовай убогай,
Якой погарджаюць горка, недбала,
Пэўна и песен счураюцца многа,
От, ведама, здумаў Янка Купала.
Шчасця так рэдка над светам усходзе,
Но досиць бывае меци хоць мала,
Долюб каб бачыў у родным народзе,
А быўбы шчасливы Янка Купала.

— 1 —

на кожны месяц» — вытрымкі з твораў мастацкай літаратуры, якія адлюстроўвалі жыццё і творчасць народаў Расійскай імперыі. Май прысвяцілі беларусам. Там былі змешчаны два вершы Янкі Купалы ў кепскім перакладзе на рускую мову і партрэт Францішка Багушэвіча з подпісам «Я. Купала, беларускі паэт». На сходзе беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта было вырашана: Купала павінен пратэставаць! Ягоны ліст Хлябцэвіч надрукаваў у газеце «Новая Русь», дзе рэдагаваў аддзел «Кніжны і бібліятэчны лісток»:

*«Гэтымі днямі я выпадкова прачытаў у календары «Альманах-каляндар для ўсіх» паміж другімі свае два вершы, перакладзеныя з беларускай на рускую мову, узятыя з маёй кнігі «Жалейка»... Хаця пераклад зроблен і нядбайна ў стылістычных адносінах і ў адносінах дакладнасці з арыгіналам, а таксама і без майго ведама, што, здаецца, у культурных краінах не практыкуецца, я вымушаны мірыцца, дзякуючы хаатычнаму становішчу нашых законаў наогул і ў асаблівасці часовых правіл аб друку, з парушэннем маёй аўтарскай уласнасці. Але вынаходлівае кнігавыдавецтва пайшло ў сваім і так непамерным захапленні яшчэ далей: яно змясціла ў гэтым жа календары чыйсці здымак, падпісаўшы пад ім маё прозвішча «Янка Купала». Гэта пераходзіць ужо ўсе межы далікатнасці, тым больш, што мой фотаздымак нідзе яшчэ не друкаваўся».*

Купала лічыць, што ў час, калі ідзе «цяжкая непамерная барацьба за нацыянальную незалежнасць», да яе прадстаўнікоў трэба «адносіцца больш карэктна і з больш разважлівай павагай».

Дарэчы, звярнулі ўвагу, як Купала называе партрэт Багушэвіча «чыімсьці здымкам», як быццам не пазнаў яго? Між тым прачытаем больш поўна тэкст рэкламнай аб'явы: «1)»Жалейка» — Янука Купалы (цана на простым паперы 50 кап., а на лепшым — 80 кап.) і 2) Smyk — M. Buraczka (цана 20 кап. і дарагое выданне — 35 кап.)». Вось жа яны побач, Купала і Мацей Бурачок — які і ёсць Францішак Багушэвіч, яшчэ адзін крамольны паэт. І кранальная дэталь: гэта час, калі Купала яшчэ ніводнага свайго партрэта ў друку не бачыў! А хацелася... Але ж надрукуй выдаўцы ягоны партрэт — і апазналі б судовыя ў Івану Дамінікавічу Луцэвічу крамольнага Янку Купалу, якога належала арыштаваць.

Зрэшты, упэўнена, што загадак і цікавых гісторый вакол «Жалейкі» знойдзецца яшчэ шмат.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

белкарт Белагропромбанк

# Правила проведения рекламной игры «КАРТА УДАЧИ»

**1. Наименование рекламной игры**

Настоящая рекламная игра называется «Карта удачи» (далее – Игра), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее – Правила) согласно требованиям законодательства Республики Беларусь без взимания с Участников Игры дополнительной платы.

**2. Сведения об Организаторе**

**2.1.** Организатором Игры является Общество с ограниченной ответственностью «Мятные мысли», УНП 193671223, зарегистрировано 08 февраля 2023 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 193671223 (далее – Организатор).

**2.2.** Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220067, г. Минск, ул. Владислава Сырокомли, д. 7, пом. 126 (вн. 258).

**2.3.** Заинтересованным лицом Игры является Открытое акционерное общество «Банковский процессинговый центр».

**3. Территория проведения Игры**

Игра поводится на территории Республики Беларусь.

**4. Период проведения Игры**

Игра проводится в период с 20.12.2023 по 14.03.2024, включая период розыгрыша и вручения призов.

**5. Комиссия по проведению Игры**

**5.1.** Для контроля за ходом Игры создается Комиссия по ее проведению. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения Игры. Комиссия состоит из Председателя и 4 членов.

Председатель Комиссии:

Богдан Лидия Владимировна – директор ООО «Мятные мысли».

Члены комиссии:

Шевчик Юлия Дмитриевна – бухгалтер ООО «Арвиум Групп»;

Мазынская Надежда Ивановна – агент по туризму ООО «Т9ТУР»;

Слюзенко Кристина Олеговна – агент по туризму ООО «Т9ТУР»;

Рабецкая Вероника Андреевна – агент по туризму ООО «Т9ТУР»;

Комиссия осуществляет контроль за соблюдением установленных Правил проведения Игры, рассматривает возникшие жалобы и предложения со стороны Участников Игры.

**5.2.** Члены комиссии обязаны осуществлять возложенные на них полномочия в течение срока проведения Игры.

**6. Наименование товаров (работ, услуг) или их групп, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра.**

**6.1.** Игра проводится в целях стимулирования проведения безналичных платежей (далее – безналичные операции) держателями банковских платежных карточек платежной системы Белкарт, а именно Белкарт, Белкарт-Премиум, Белкарт-Премиум-Maestro, эмитированных ОАО «Белагропромбанк», (далее – карточки Белкарт), а также пользователями мобильного платежного приложения Белкарт Pay, в котором для оплаты используется токенизированная карточка Белкарт, эмитированная ОАО «Белагропромбанк» (далее – приложение Белкарт Pay).

Под карточкой Белкарт понимается платежный инструмент, обеспечивающий доступ к счету субъекта платежных правоотношений для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь, на котором имеется логотип Белкарт.

Под токенизированной карточкой Белкарт понимается цифровой аналог карточки Белкарт, загружаемый в приложение Белкарт Pay при токенизации карточки Белкарт держателем в приложении Белкарт Pay, загруженном на мобильное устройство.

**7. Участники Игры.**

**7.1.** Участниками Игры являются физические лица – держатели карточек Белкарт, эмитированных ОАО «Белагропромбанк», достигшие 18 лет.

**7.2.** Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, а также Члены комиссии.

**7.3.** Участниками Игры не могут быть члены наблюдательного совета, члены правления, исполнительные директоры, руководители самостоятельных структурных подразделений ОАО «Белагропромбанк» и лица их замещающие, осуществляющие деятельность в период проведения Игры.

**8. Состав и размер призового фонда**

Призовой фонд Игры формируется за счет денежных средств Заинтересованного лица.

Общий размер призового фонда составляет 52 939,24 (пятьдесят две тысячи девятьсот тридцать девять) белорусских рублей 24 копейки.

**Таблица 1.**

| № п/п | Наименование призов, участвующих в розыгрыше | Название приза далее в Правилах | Кол-во (шт.) | Стоимость за 1 ед., белорусских рублей | Всего стоимость, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Денежный приз 30 000 BYN | Главный приз | 1 | 30 000,00 | 35 339,14 |
| | Денежная сумма для оплаты комиссии банка | | | 769,23 | |
| | Денежная сумма для оплаты подоходного налога | | | 4 569,91 | |
| 2 | Денежный приз 5 000 BYN | Приз № 1 | 3 | 5 000,00 | 17 600,10 |
| | Денежная сумма для оплаты комиссии банка | | | 128,21 | |
| | Денежная сумма для оплаты подоходного налога | | | 738,49 | |

**9. Условия участия в Игре.**

**9.1.** Для участия в Игре физическому лицу необходимо:

**9.1.1.** Являться или стать держателем карточки Белкарт в период с 00:00:01 20.12.2023 по 23:59:59 20.02.2024 включительно.

**9.1.2.** В период с 00:00:01 20.12.2023 по 23:59:59 20.02.2024 включительно совершать с использованием карточки Белкарт и/или приложения Белкарт Pay безналичные операции (транзакции) на сумму 15 (Пятнадцать) белорусских рублей 00 копеек и более каждая на территории Республики Беларусь по оплате (приобретению) товаров/работ/услуг в организациях торговли (сервиса) на территории Республики Беларусь, а также операции в сети Интернет, за исключением операций, указанных в п.п. 9.7 Правил.

**9.1.2.1.** В розыгрыше приза «Главный приз» участвуют Участники Игры, совершившие безналичные операции с использованием карточки Белкарт и/или приложения Белкарт Pay на сумму 30,00 (Тридцать) белорусских рублей 00 копеек и более и зарегистрировавшие карт-чек на Сайте Игры.

**9.1.2.2.** В розыгрыше призов «Приз № 1» участвуют Участники Игры, совершившие безналичные операции с использованием карточки Белкарт и/или приложения Белкарт Pay на сумму 15,00 (Пятнадцать) белорусских рублей 00 копеек и более и зарегистрировавшие карт-чек на Сайте Игры.

**9.1.3.** В период с 00:00:01 20.12.2023 по 23:59:59 20.02.2024 зарегистрироваться в личном кабинете на интернет-сайте www.igra-belkart.by (далее – Сайт Игры), заполнив Персональные данные, дать согласие на обработку Персональных данных в целях проведения Игры и подтвердить согласие на участие в Игре, а именно:

- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно, при наличии);

- адрес пребывания, проживания в Республике Беларусь: индекс (обязательно), область (обязательно), район (обязательно, при наличии), населенный пункт (обязательно), улица (обязательно, при наличии), дом (обязательно), корпус (обязательно, при наличии), номер квартиры (обязательно, при наличии);

- адрес электронной почты (желательно);

- личный номер телефона в формате – код страны, код оператора или междугородний телефонный код населенного пункта, номер абонента (пример +375330000000, где 375 – код страны, 33 – код оператора (населенного пункта), а 0000000 – номер абонента, без пробелов и символов);

- дать согласие на обработку Персональных данных в целях проведения Игры, поставив галочку о согласии на обработку Персональных данных:

- изучить настоящие Правила и поставить галочку об ознакомлении с ними.

**9.1.4.** В период с 00:00:01 20.12.2023 по 23:59:59 20.02.2024 включительно зарегистрировать карт-чеки, путём заполнения данных о безналичной операции в личном кабинете, а именно:

- дата совершения безналичной операции, согласно соответствующему карт-чеку;

- сумма операции;

- последние четыре цифры банковской карточки Белкарт, с помощью которой была совершена безналичная операция;

- указать четыре цифры номера токенизированной карточки, если безналичная операция была совершена с помощью приложения Белкарт Pay;

- загрузить фото карт-чека, в том числе карт-чека при совершении операций в сети Интернет.

Под карт-чеком понимается документ на бумажном носителе и (или) в электронном виде, служащий подтверждением совершения операции при использовании карточки Белкарт и/или приложения Белкарт Pay и являющийся основанием для оформления платежных инструкций для осуществления безналичных расчетов, составленный в соответствии с требованиями банка-эквайера, законодательства Республики Беларусь и (или) правил платежной системы.

Регистрация каждого нового карт-чека производится отдельно с заполнением Участником данных, указанных в п.п. 9.1.4.

**9.2.** При совершении физическим лицом безналичных операций, соответствующих Правилам, такое физическое лицо каждый раз регистрирует карт-чек в личном кабинете на Сайте Игры.

**9.3.** В случае, если одна и та же уникальная безналичная операция будет успешно зарегистрирована на Сайте Игры более одного раза, она будет приниматься для участия в розыгрыше только один раз по факту первой регистрации данных уникальной безналичной операции в регистрационной форме Сайта и участвовать в розыгрыше на основании такой регистрации.

**9.4.** Уведомление об успешной авторизации личного кабинета и успешной регистрации карт-чека на Сайте Игры осуществляется в личном кабинете. В случае, если клиент получил уведомление о неуспешной авторизации личного кабинета на Сайте Игры, Участнику необходимо обратиться к Организатору Игры по телефону, указанному в п.п. 14.2.

**9.5.** Участник Игры обязан соблюдать нормы законодательства Республики Беларусь и правила пользования банковскими платежными карточками, установленными ОАО «Белагропромбанк».

**9.6.** Участнику Игры, соответствующему требованиям п.п. 9.1 Правил, перед розыгрышем присваивается порядковый номер (далее – Номер участника) согласно п.п. 10.5 Правил.

**9.6.1.** За выполнение п.п. 9.1. Правил Участнику Игры присваивается 1 (один) Номер участника за каждый зарегистрированный на Сайте Игры карт-чек на сумму 15,00 (Пятнадцать) белорусских рублей 00 копеек и более для участия в розыгрыше приза «Приз № 1».

За выполнение п.п. 9.1 Правил Участнику Игры присваивается 1 (один) Номер участника за каждый зарегистрированный на Сайте Игры карт-чек на сумму 30,00 (Тридцать) белорусских рублей 00 копеек и более для участия в розыгрыше приза «Главный приз».

Например, Участник Игры, совершивший с использованием карточки Белкарт и/или приложения Белкарт Pay безналичные операции, соответствующие Правилам, и зарегистрировавший на Сайте Игры в период с 00:00:01 20.12.2023 по 23:59:59 20.02.2024 карт-чеки на суммы: 18,00 (Восемнадцать) белорусских рублей 00 копеек, 21,00 (Двадцать один) белорусский рубль 00 копеек, 35,00 (Тридцать пять) белорусских рублей 00 копеек, получает 3 (три) Номера участника для участия в розыгрыше приза «Приз № 1» и 1 (один) Номер участника для участия в розыгрыше приза «Главный приз».

**9.7.** Не являются основанием для участия в Игре:

- не создан личный кабинет на Сайте Игры и не проведены регистрации карт-чеков на Сайте;

- безналичные операции, совершенные ранее 00:00:00 20.12.2023 и позднее 23:59:59 20.02.2024;

- операции по снятию наличных денежных средств или пополнению счета;

- операции по переводу денежных средств с одной банковской платежной карточки на другую банковскую платежную карточку;

- операции по оплате коммунальных услуг;

- операции, совершенные в автоматизированной информационной системе единого расчетного и информационного пространства (ЕРИП);

- безналичные операции, совершенные посредством банкоматов, инфокиосков, платежных терминалов самообслуживания, мобильного интернет-банкинга, интернет-банкинга, «FinTeam», в кассах подразделений банка, в почтовых отделениях, в том числе РУП «Белпочта»;

- безналичные операции, связанные с оплатой телекоммуникационных услуг и приобретением телекоммуникационного оборудования, включая продажу телефонов в салонах связи (Унитарное предприятие по оказанию услуг «А1», СООО «Мобильные ТелеСистемы», ЗАО «БеСТ» и др.);

- операции по размещению (пополнению) вкладов (депозитов);

- операции по оплате кредитных обязательств и банковских комиссий;

- операции по оплате налогов, штрафов, взносов, обязательных государственных пошлин;

- безналичные операции, связанные с азартными играми (включая операции в казино и иных игровых заведений, оплата ставок и пари, в том числе через интернет);

- операции, связанные с пополнением электронных кошельков;

- операции, по которым в течение периода с 00:00:01 20.12.2023 по 23:59:59 20.02.2024 включительно были совершены возвраты денежных средств на счет, доступ к которому обеспечивается с использованием карточки Белкарт Участника Игры.

**10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда**

**10.1.** Место проведения розыгрыша – г. Минск, ул. Смоленская, 25, офис 108.

**10.2.** Дата и время проведения розыгрыша – 27 февраля 2024 г. в 12.00.

**10.3.** Розыгрыш призового фонда проводится открыто с возможностью присутствия на нем Участников Игры. Результаты розыгрыша Игры не должны зависеть от воли Организатора и не могут быть никем специально устроены.

**10.4.** Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в Таблице 1 настоящих Правил.

**10.5.** Для проведения розыгрыша призового фонда Организатором формируются списки из Участников Игры, выполнивших условия настоящих Правил (далее – Списки):

- Список для розыгрыша приза «Приз № 1»;

- Список для розыгрыша приза «Главный приз».

В каждом Списке Участнику присваивается порядковый номер (далее – Номер участника), согласно дате и времени регистрации безналичной операции на Сайте Игры, фамилии, имени, отчеству (при наличии) участников по алфавиту. В случае совпадения у нескольких участников даты и времени регистрации безналичной операции на Сайте Игры, Номера участников присваиваются по фамилии, имени, отчеству (при наличии) участников по алфавиту.

В случае совпадения у нескольких участников фамилии, имени, отчества (при наличии) Номера участников присваиваются по последним 4 (четырем) цифрам номера карточки Белкарт и/или приложения Белкарт Pay участников по возрастанию.

Все Номера участников для каждого розыгрыша имеют одинаковую разрядность.

**10.5.1.** Каждый Список для розыгрыша призов содержит следующую информацию: Номер участника, дата и время регистрации безналичной операции на Сайте Игры, фамилию, имя, отчество (при наличии) Участника Игры, последние четыре цифр номера карточки Белкарт и/или последние четыре номера токенизированной карточки при оплате приложением Белкарт Pay Участника Игры, сумма безналичной операции.

**10.6.** Для определения Победителей используются лототрон и набор шаров в количестве 10 (десяти) штук с цифрами от 0 (нуля) до 9 (девяти) включительно. Определение выигрышных Номеров участников происходит путем их формирования слева направо из цифр в шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

**10.6.1.** Для определения цифры первого слева разряда выигрышного Номера участника в лототрон помещаются шары с цифрами от 0 (нуля) до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего по порядку номера в Списке. Член комиссии извлекает из лототрона один шар. Цифра из извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного Номера участника.

**10.6.2.** Далее в лототрон загружаются все десять шаров. Шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, цифра в котором определяет цифру следующего разряда выигрышного Номера участника. Производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах Номеров участников. При наличии совпадения цифра вытянутого шара записывается в соответствующий разряд выигрышного Номера участника – и шар возвращается в лототрон; в противном случае – извлеченный шар с цифрой не возвращается в лототрон и Член комиссии извлекает следующий шар до получения нужного совпадения.

**10.6.3.** Шары извлекают до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон цифр соответствующих разрядов Номеров участников в Списке. Таким образом формируются все выигрышные Номера участников в каждом Списке.

**10.7.** Участник Игры может выиграть только один из призов «Приз № 1» в розыгрыше. В случае, если выигрышным становится Номер участника, принадлежащий Участнику Игры, уже выигравшему один из призов в розыгрыше, выигрышным признается следующий по Списку Номер участника другого Участника Игры. При этом, Участник Игры продолжает принимать участие в розыгрыше приза «Главный приз».

**10.8.** При проведении розыгрыша дополнительно определяются по два резервных победителя для каждого приза. Резервными победителями становятся следующие два за выигрышным по Списку Номера участников, принадлежащих другим Участникам Игры.

**10.9.** Результат каждого розыгрыша в обязательном порядке фиксируется в протоколе, который подписывается присутствующими на заседании членами комиссии по проведению Игры.

**11. Срок и способ информирования Победителей розыгрыша призового фонда. Место, порядок и срок выдачи выигрышей.**

**11.1.** Организатор уведомляет Победителей/Резервных победителей о выигрыше приза «Главного приза» и призов «Приз № 1» по телефону и письменно заказным письмом с уведомлением в сроки, указанные в Таблице 2.

**11.2.** Для получения «Приза № 1» или «Главного приза» Победитель/Резервный победитель не позднее сроков, установленных в Таблице 2 настоящих Правил, должен выслать Организатору на электронную почту info@igra-belkart.by следующую информацию:

- копию паспорта (страницы 25, 31-33) или идентификационной карты – для граждан Республики Беларусь;

- копию вида на жительство (страницы 3, 15-17), в том числе биометрического – для лиц, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь;

- заявление/выписку об открытии текущего (расчетного) банковского счета, к которому выпускается карточка Белкарт, на который будет перечисляться сумма приза.

**11.3.** Организатор перечисляет Призы №1 и Главный приз (за вычетом денежной суммы для оплаты подоходного налога) Победителю/Резервному победителю на текущий (расчетный) банковский счет, открытый на имя Победителя/Резервного победителя, доступ к которому обеспечивается посредством карточки Белкарт, в сроки, указанные в Таблице 2 Правил.

**Таблица 2**

| Сроки уведомления о выигрыше | Сроки отправки Организатору, необходимых документов, указанных в п.п. 11.2 Правил | Сроки перечисления Призов № 1/ Главного приза |
|---|---|---|
| Основные победители | | |
| По 29.02.2024 включительно | По 03.03.2024 включительно | По 06.03.2024 включительно |
| Резервные победители | | |
| В течение 2 (двух) дней со дня определения Победителем Приза/ Главного приза, но не позднее 08.03.2024 | По 11.03.2024 включительно | По 14.03.2024 включительно |

**11.4.** Призы № 1/Главный приз перечисляются Резервным победителям в случае, если основной Победитель:

- отказался от получения Приза № 1/Главного приза, о чем письменно известил Организатора Игры, по адресу: 220067, г. Минск, ул. Владислава Сырокомли, д. 7, пом. 126 (вн. 258);

- нарушает (не выполняет) условия Правил, в том числе не представил необходимые документы, указанные в Правилах, в сроки и в порядке, установленные Правилами;

- не выходит на связь с Организатором в сроки и в порядке, установленные Правилами.

**11.5.** Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводятся в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь и осуществляется Организатором. Удержание с Победителей/Резервных победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в день перечисления Призов № 1/Главного приза Победителям/Резервным победителям из денежной суммы для оплаты подоходного налога приза (денежная сумма удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

**12. Права и обязанности Участников Игры.**

**12.1.** Принимая участие в Игре, Участники Игры подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования Правил и законодательства, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением Призов №1 и Главного приза.

**12.2.** Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них без уплаты им какого-либо вознаграждения могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Игры. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

**12.3.** Победители/Резервные победители, претендующие на получение Призов №1 и Главного приза, обязуются представить всю необходимую информацию для их получения и выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения выигранных призов.

**13. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.**

**13.1.** Правила Игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Игры.

**13.2.** Результаты розыгрышей Игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 12.03.2024 г.

**14. Порядок представления информации по вопросам проведения Игры.**

**14.1.** Все возможные вопросы и претензии Участников Игры в отношении организации и условий передачи призов должны быть адресованы Организатору Игры по адресу: 220067, г. Минск, ул. Владислава Сырокомли, д. 7, пом. 126 (вн. 258).

**14.2.** Информацию об условиях участия и проведения Игры можно получить по телефону 8 033 350 11 10 ежедневно с 10.00 до 17.00, а также на Сайте Игры.

**15. Общие положения.**

**15.1.** Организатор не вступает в споры между Участниками Игры относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

**15.2.** Организатор не несет ответственности за качество работы почтовых служб, в частности за недоставку либо несвоевременную доставку почтовой корреспонденции.

*Свидетельство № 4388 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 12 декабря 2023 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

# ПАДАРУНКІ ЛЮБІМАМУ ГОРАДУ

## Ідзем у «ЦУМ МІНСК» па навагодні настрой

**Колькі б ні споўнілася нам гадоў, ад зімніх свят мы чакаем цудаў. Але каб навагоднае чараўніцтва адбылося, патрэбны адпаведныя магічныя атрыбуты: упрыгожаная ёлка, іскрыстыя гірлянды і ў першую чаргу, вядома ж, падарункі. Выбар падарункаў, якія сапраўды парадуюць, — задача няпростая. І ісці па іх лепш туды, дзе выбар вялікі, усё неабходнае можна знайсці пад адным дахам і — што немалаважна — ёсць перадсвяточныя зніжкі. Пад гэтыя крытэрыі ідэальна падыходзіць сталічны «ЦУМ МІНСК».**

Тэматычная пасцельная бялізна якаснага складу ў секцыі «Тавары для дома».

## Аб многім — без лішніх слоў

Узімку асабліва цэніцца цеплыня і камфорт. А значыць, адпраўляемся ў секцыю тавараў для дома, дзе ў гэтыя перадсвяточныя дні — амаль бязмежны выбар пасцельнай бялізны, у тым ліку навагодняй тэматыкі. Ад экалагічных ільняных калекцый да мяккай, пяшчотнай фланелі («Блакіт») і сацыну (напрыклад, ад брэнда Samsara). Рознага памеру, у камплектах і «россыпам», ад 50 рублёў і танней да 150 рублёў — варыянт можна знайсці на любы густ і кашалёк. Такі падарунак раскажа аб вашых цёплых пачуццях без лішніх слоў.

Зімовыя святы — час, калі сям'я збіраецца за накрытым сталом. Асартымент сталовай бялізны ў навагодніх расфарбоўках у галоўным універмагу сталіцы неверагодна шырокі. Ёсць падарункавыя варыянты ў святочнай упакоўцы з ёлачнай цацкай у камплекце (ад кампаніі «Блакіт», кошт — да 100 рублёў), а таксама навагоднія абрусы ў межах 50-52 рублёў ад беларускіх і замежных вытворцаў, з класічнага лёну або сучасных тканін. Тым, хто шукае нешта асаблівае, ЦУМ прапануе шэраг унікальных таварных пазіцый — такія рэчы можна набыць толькі тут.

Сярод запатрабаваных падарункаў прадаўцы секцыі тавараў для дома называюць таксама навагоднія камплекты ручнікоў (ад Аршанскага льнокамбіната — усяго 14.30 за набор), кухонных прыхватак з сімвалам 2024 года Драконам, цудоўныя дэкаратыўныя навалачкі ад ААТ «Магатэкс». Гэтыя мілыя і недарагія рэчы часта купляюць, каб павіншаваць сяброў ці калег. Выдатны падарунак дзіцяці — камплект «Дракоша»: мяккая цацка на прысосцы — трымальнік для ручніка.

Загадчык секцыі бытавой тэхнікі, радыёэлектронікі Наталля МАЗГО дэманструе найлепшы падарунак для мужчын: электрагрыль.

## Дзясяткі натхняльных ідэй

Пераходзім у секцыю бытавой тэхнікі: тут можна знайсці безліч ідэй навагодніх падарункаў. Добрым выбарам стане электрагрыль ад фірмы Aresa. Навагодняя зніжка зробіць гэты падарунак не надта цяжкім для вашага кашалька (164 рублі), між тым, рэч сапраўды карысная. Бо электрагрыль дазваляе без лішніх намаганняў прытрымлівацца прынцыпаў правільнага харчавання: гародніну, мяса і рыбу на ім можна смажыць без алею. Яшчэ адна ідэя падарунка для тых, хто клапоціцца аб здароўі любімых — зубная электрашчотка. Можна абраць гаджэт ад фірмы Braun (еўрапейскай зборкі, з некалькімі рэжымамі і таймерам) або варыянт ад той жа кампаніі Aresa.

Дзяўчыны і жанчыны ацэняць паднесены ў дар фен або стайлер. У наяўнасці ў ЦУМе як кампактныя моцныя фены (іх можна браць у басейн ці падарожжа), так і напаўпрафесійныя, з рознымі насадкамі і функцыяй іанізацыі, дзякуючы чаму нават зімой ваша прычоска не будзе пушыцца.

Выдатны падарунак — вертыкальны адпарвальнік, альтэрнатыва класічнаму прасу (у ЦУМе такі гаджэт каштуе ад 80 рублёў). Ёсць мадэлі не толькі з вертыкальным адпарваннем, але і з магчымасцю прасаваць адзенне ў гарызантальнай плоскасці, а таксама з насадкамі, каб пазбаўляць тканіну ад шэрсці гадаванцаў.

Жаданым падарункам прыгожай палове стануць і вагі, падлогавыя або кухонныя. Гаспадынь абрадуе міксер ці блэндар, амататараў кавы — кавамолка. Моладзь ацэніць бесправадныя навушнікі: ЦУМ гарантуе якасць гуку, а шырокі мадэльны рад дазваляе выбраць аксесуар пад любы стыль.

## Шчасце ўваходзіць у дом праз кухню

Адпраўляемся ў секцыю «Посуд». Адсюль без навагодніх пакупак вы не выйдзеце: ад мілаты проста разбягаюцца вочы. Чайныя кубачкі (ад 10 рублёў), чайнікі (да 45 рублёў), блюды для сервіроўкі навагодняга стала (ад 20-25 рублёў), самай рознай формы салатнікі — кераміка, фарфор, крышталь... Крэатыўная ідэя падарунка — набыць адзін з мноства прадстаўленых у асартыменце кухонных слоічкаў з сімвалам года ці іншым навагоднім роспісам і напоўніць яго шакаладнымі цукеркамі і імбірным печывам. Дапоўніць падарунак можна керамічнай або крыштальнай фігуркай дракончыка — яны прапануюцца ў розных памерах і афармленні, а каштуюць у межах 20-25 рублёў. Печыва, зрэшты, варта спячы самастойна. У гэтым дапамогуць формачкі для цеста: іх можна набыць проста для сябе, а яшчэ такі набор — выдатны падарунак для дарагіх сяброў і блізкіх. Карысных навагодніх дробязяў на падарунку ў гэтай секцыі мноства — ад падставак пад кубкі да міні-сподкаў пад чайныя пакецікі. Ну, а маме ці бабулі дакладна прыйдзецца даспадобы навагодні набор рондаляў: яны карыстаюцца попытам, адзначылі прадаўцы.

У секцыі посуду прадстаўлены шырокі асартымент бакалаў.

## Найлепшыя сябры дзяўчын

Ювелірныя вырабы — спосаб прыгожа прызнацца ў каханні жонцы або нявесце, маці, сястры, дачцэ. Да навагодняга сезона ЦУМ прадставіў пакупнікам апошнія калекцыі айчынных і замежных ювелірных кампаній з золата і срэбра, з каштоўнымі і напаўкаштоўнымі камянямі. І, вядома, паклапаціўся аб зніжках (дастаткова сказаць, што на некаторыя ўпрыгожванні яны дасягаюць 60 %). Вырашыўшы спыніцца на срэбным аксесуары, разлічваць варта на суму ад 50 да 1000 рублёў, а калі ваш выбар — залатое ўпрыгожванне, пачынаць давядзецца ад 500 рублёў. Сярэбраныя калекцыі ў асартыменце як дэмакратычныя, так і вячэрнія, з рознага кошту і колеру камянямі і моднай сённяя эмаллю, залатыя ўпрыгожванні — з дыяментамі, ізумрудамі, рубінамі, натуральным жэмчугам... Чырвонае, белае і лімоннае золата ў секцыі ювелірных вырабаў ЦУМа прапаноўваецца ў розных адценнях. Ёсць і дзіцячыя калекцыі — з французскай і англійскай зашпількамі завушніц, якія не траўміруюць вуха. Калі ўпрыгожванне вы выбіраеце ў падарунак маленькай прыгажуні, асабліва каштоўна, што на ўсе ювелірныя вырабы ўніверсмаг дае паўгадавую гарантыю.

У секцыі ювелірных вырабаў сапраўды можна знайсці тое, што прыйдзецца да душы дарагім жанчынам. На фота: асартымент бранзалетаў з золата.

## ЦУМ дапаможа сэканоміць

**Увесь снежань пакупнікам мноства зніжак.**

Калі ў вас ёсць дысконтная карта, вы будзеце плаціць на **10 %** менш пазначанай на цэнніку сумы **4, 11, 18 і 31 снежня.**

І практычна ўвесь месяц (**1, 2, 3, 6, 7, 8, 9, 10, 12, 13, 14, 15, 16, 17, 19, 20, 21, 22, 23, 24, 25, 26, 27, 28, 29, 30 снежня**) зніжка для ўсіх пакупнікоў будзе дасягаць да **-45 %** на адзінку тавару коштам ад 7 рублёў.

У гэтыя перадсвяточныя дні секцыя **«Ювелірныя вырабы»** ЦУМа прапануе зніжкі на ўпрыгожванні з золата **-25 %, 30 %, 35 %, 50 %.**

На вырабы са срэбра зніжкі складаюць **30 %, 40 %, 45 %, 55 % і 60 %.**

У секцыі **«Бытавая тэхніка, радыёэлектроніка»** ўвесь снежань на буйнагабарытную бытавую тэхніку прадугледжаны зніжкі да **-15 %,** на дробную бытавую тэхніку — да **-30 %.**

Секцыя **«Посуд»** у снежні прадстаўляе пакупнікам зніжкі да **-35 %,** а секцыя **«Тавары для дома»** — да **-30 %.**

Аляксандра АНЦЭЛЭВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Лізаветы ГОЛАД.

УНП 100346874

# РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «СУПЕРДЕТИ»

**Сведения о рекламной игре**

Наименование рекламной игры: «Супердети». Территория проведения: Республика Беларусь.
Период проведения: с 22 августа по 22 декабря 2023 года.
В рекламной игре приняли участие 1977 человек. Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

Победителями стали:

| № | Наименование приза | ФИО победителя |
|---|---|---|
| 1 | Платформа домашняя мультимедийная «Новая Яндекс. Станция Мини с часами», модель: YNDX-00020 (Яндекс. Станция Мини Плюс с часами, второе поколение). Цвет серый. Артикул: 00020G s/n: 2313F01231220G и денежные средства в размере 7,53 бел. руб. | Усхопов Павел Юрьевич |
| 2 | Платформа домашняя мультимедийная «Новая Яндекс. Станция Мини с часами», модель: YNDX-00020 (Яндекс. Станция Мини Плюс с часами, второе поколение). Цвет серый. Артикул: 00020G s/n: 2313F01214520G и денежные средства в размере 7,53 бел. руб. | Скребков Владимир Евгеньевич |
| 3 | Платформа домашняя мультимедийная «Новая Яндекс. Станция Мини с часами», модель: YNDX-00020 (Яндекс. Станция Мини Плюс с часами, второе поколение). Цвет серый. Артикул: 00020G s/n: 2313F01193920G и денежные средства в размере 7,53 бел. руб. | Хомич Анна Вячеславовна |
| 4 | Платформа домашняя мультимедийная «Новая Яндекс. Станция Мини с часами», модель: YNDX-00020 (Яндекс. Станция Мини Плюс с часами, второе поколение). Цвет серый. Артикул: 00020G s/n: 2313F01020920G и денежные средства в размере 7,53 бел. руб. | Ракитин Александр Александрович |
| 5 | Платформа домашняя мультимедийная «Новая Яндекс. Станция Мини с часами», модель: YNDX-00020 (Яндекс. Станция Мини Плюс с часами, второе поколение). Цвет серый. Артикул: 00020G s/n: 2313F00688020G и денежные средства в размере 7,53 бел. руб. | Лесневская Людмила Анатольевна |
| 6 | Платформа домашняя мультимедийная «Новая Яндекс. Станция Мини с часами», модель: YNDX-00020 (Яндекс. Станция Мини Плюс с часами, второе поколение). Цвет серый. Артикул: 00020G s/n: 2313F00065920G и денежные средства в размере 7,53 бел. руб. | Ризо Тамара Александровна |
| 7 | Платформа домашняя мультимедийная «Новая Яндекс. Станция Мини с часами», модель: YNDX-00020 (Яндекс. Станция Мини Плюс с часами, второе поколение). Цвет серый. Артикул: 00020G s/n: 2313F00992220G и денежные средства в размере 7,53 бел. руб. | Дравица Дмитрий Евгеньевич |
